Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 ВЕРАСНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 171 (28281)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Пенсіі: каму, як і колькі?**

СТАР. 7



**Пазбегнуць інфаркту**

СТАР. 11



**Стары Свет зноў ліхаманіць**

СТАР. 12

# ЭСТАФЕТУ Ў РАГАЧОВА ПРЫМАЕ ПОЛАЦК

## Налета, у год 500-годдзя надрукавання Францыскам Скарынам Біблії, свята пісьменства пройдзе на Віцебшчыне







Фота БЕЛТА.

**А сёлета Гомельшчына чацвёрты раз прымала Дзень беларускага пісьменства. Двойчы яго ладзілі ў Тураве, адзін раз — у Хойніках і вось цяпер — у Рагачове. «Пашанцавала!» — лічаць жыхары гарадка, колькасць насельнікаў якога ў дзень свята павялічылася, напэўна, на траціну. Дзень пісьменства кардынальна змяніў райцэнтр — капітальна адрамантавана каля 40 аб'ектаў. Усіх радуе новая чатырохпалосная дарога ў цэнтры, уладкаваны парк з фантанам, азёры з альтанкамі на месцы балота і шмат іншых прыемных падарункаў, якія застануцца тут назаўсёды.**

**Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ** падкрэсліла, што ў кожным горадзе, дзе праходзіў Дзень пісьменства, ёсць цяпер такія знакавыя аб'екты:

— Гэта тое свята, якое пакідае пасля сябе не толькі духоўны след, але і матэрыяльныя каштоўнасці. Але галоўнае, каб кожны, хто пабываў тут, задумаўся, наколькі важная пераемнасць пакаленняў, калі досвед і мудрасць, назапашаныя продкамі, перадаюцца нашчадкам. Рагачоўшчына ўзгадавала не аднаго таленавітага майстра слова. Гэта дастойнае месца, і свята атрымалася годным і праходзіць на самым высокім узроўні. Дзень беларускага пісьменства — гэта магчымасць дзяржавы падзякаваць пісьменнікам, навукоўцам, літаратарам і ўсім, хто мае дачыненне да захавання роднага слова.

**Намеснік прэм'ер-міністра, старшыня Нацыянальнага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства ў Рагачове Наталля КАЧАНАВА** шчыра вітала прысутных са святам. Яна агучыла прывітальныя словы Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі і адзначыла, што падчас падрыхтоўкі ў горадзе абноўлены важныя сацыяльныя і культурныя аб'екты:

— Свята скончыцца, а горад застанецца на доўгія гады такім прыгожым. Вядома, пасля свята толькі ад высілкаў мясцовых жыхароў будзе залежаць, як гэта будзе захавана.

### «З глыбокай павагай да моўнай спадчыны»

— Свята набывае асаблівае гучанне ў Год культуры, калі мы звяртаемся да духоўных крыніц нашага народа, — заўважыў на цырымоніі адкрыцця **старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК**, — Мне вельмі прыемна, што сёлетняй сталіцай беларускага пісьменства стаў Рагачоў. Гомельская зямля багатая на таленты, тут нарадзіліся чатыры народныя пісьменнікі Беларусі: ураджэнец Рагачоўскага раёна Андрэй Макаёнак і тры Іваны — Навуменка, Мележ і Шамякін. Вялікая колькасць гасцей на гэтым свяце паказвае глыбокую павагу беларусаў да нашай багатай моўнай спадчыны і чарговы раз даказвае, што ў век інфармацыйных тэхналогій кніга па-ранейшаму застаецца неад'емным атрыбутам паўсядзённага жыцця. Упэўнены, свята беларускага пісьменства дапаможа прыцягнуць увагу нашых жыхароў, асабліва моладзі, да нацыянальнай культуры, заахвоціць звярнуцца да твораў класікаў і сучаснікаў.

Перадаў у дар бібліятэцы кнігу «Беларусь замкавая» **старшыня Рагачоўскага райвыканкама Сяргей ДЗЯНІСЕНКА.** Ён нагадаў, што менавіта на гэтай зямлі калісьці існаваў замак гаспадыні горада каралевы Боны:

— Замак быў, на жаль, страчаны. Спадзяюся, што праз пэўны час выявы нашага замка таксама будуць на старонках мастацкіх выданняў. Гэтае свята — выдатная магчымасць паказаць культурнае багацце нашага краю ўсім жыхарам рэспублікі.

Даволі часта адносіны з кнігамі ў нас складваюцца як і з людзьмі. З многімі мы знаёмімся, але толькі некаторых выбіраем у сябры і спадарожнікі жыцця. Для мяне такімі з'яўляюцца кнігі пра мінуўшчыну нашага краю.

СТАР. 8

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«Сітуацыю, звязаную з правядзеннем парламенцкіх выбараў у нашай краіне, трэба ацэньваць па канкрэтных выніках, лічбах і фактах. Але голыя лічбы і факты — гэта не самае галоўнае. Трэба глядзець на развіццё сітуацыі і на тое, што стаіць за лічбамі і фактамі. Толькі такі падыход дасць аб'ектыўны аналіз. Беларусь мае намер правесці парламенцкія выбары максімальна транспарэнтна, дэмакратычна і празрыста».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.09.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9585 | ▼ |
| Еўра | 2,1889 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0302 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0730 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

16171

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Пачалася падпіска на «Звязду» на IV квартал!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ПЫТАННІ КАНЦЭПЦЫІ, ТАКТЫКІ, СТРАТЭГІІ

## Сістэму падрыхтоўкі беларускіх хакеістаў трэба рэфармаваць

**Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі хакея Рэнэ Фазелем.**

«Мы вельмі сур'ёзна, што тычыцца канцэпцыі, тактыкі, стратэгіі хакея, прайграём заакіянскім спартсменам. Нам трэба вельмі сур'ёзна звярнуць увагу на сістэму падрыхтоўкі спартсменаў, і хакеістаў перш за ўсё, запазычваючы вопыт канадцаў і амерыканцаў — яны гуляюць зусім у іншы хакей, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы і расіяне, ды і еўрапейцы пачынаюць адставаць, гуляем па-старому. Гэта тычыцца асабліва беларускага хакея».

Яшчэ адной з праблем у беларускім хакеі, на думку Прэзідэнта, з'яўляецца нізкая матываванасць гульцоў з прычыны нізкай канкурэнцыі ў камандзе. Таму вялікую ўвагу неабходна надаваць падрыхтоўцы рэзерву.

Кіраўнік дзяржавы таксама падкрэсліў, што кадры ў спорце вырашаюць усё, яны павінны бачыць усе недахопы і не ўтойваць іх. «Я ўжо даручыў сур'ёзную ўвагу звярнуць на кадры, якія сёння занятыя ў спартыўнай індустрыі, асабліва ў хакеі, таму што гэта вельмі папулярны, можна сказаць нацыянальны від спорту разам з футболам, і самы масавы», — заўважыў беларускі лідар.

«Шчыра кажучы, перад сустрэчай я задумаўся, што мы, напэўна, са сваім цяперашнім хакеем не заслугоўваем столькі ўвагі, колькі вы надаяце нашай краіне. Але ў наступныя два-тры гады — адразу гэта не робіцца — мы парадак навядзём у спорце ў цэлым і ў хакеі ў прыватнасці», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым Прэзідэнт адзначыў, што яго ацэнка сітуацыі ў беларускім хакеі не звязана з няўдалым выступленнем нацыянальнай зборнай у алімпійскай кваліфікацыі 2018-га. «З майго пункту гледжання, так і павінна было здарыцца, таму што мы ж памятаем, як каманда гуляла на апошнім чэмпіянаце свету ў маі гэтага года — адскочылі ў апошнім матчы. І замест таго, каб усё лета займацца і рыхтавацца да гэтых Гульняў, яны, мабыць, на поўдні адпачывалі. Таму так і атрымалася: хто хацеў выйграць і паехаць на Алімпіяду, той выйграў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

На сустрэчы было адзначана, што ў спорце павінны быць буйныя перамогі, тады і паражэнні будуць успрымацца зусім інакш, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. Акрамя таго, адзначыў Прэзідэнт, спартсмены павінны падыходзіць да спаборніцтваў на піку сваёй формы, каб паказваць яшчэ лепшыя вынікі, чым на этапе падрыхтоўкі да турніраў.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу, што Беларусь гатовая зноў прыняць чэмпіянат свету па хакеі. «Як я абяцаў раней, гэта будзе самы лепшы чэмпіянат свету, таму што ў нас для гэтага ўсё ёсць. Калі мы да мінулага чэмпіянату ўсё будавалі і стваралі, то сёння для таго, каб прыняць найлепшых майстроў гэтага віду спорту, усё неабходнае ёсць. І калі будзе прынята такое рашэнне, мы годна правядзём гэты чэмпіянат свету», — падкрэсліў Прэзідэнт.

У сваю чаргу Рэнэ Фазель адзначыў, што Міжнародная федэрацыя хакея сур'ёзна разглядае магчымасць правядзення ў Беларусі чэмпіянату свету па хакеі ў 2021-м ці 2022-м годзе, а ў беларускіх хакеістаў ёсць усе шанцы, каб падрыхтавацца да будучых турніраў і паказаць на іх добрыя вынікі.




■ Выбары-2016

# ПОЎНАЯ ГАТОЎНАСЦЬ

## Пачаў сваю працу інфармацыйны цэнтр ЦВК

**Участкі па ўсёй Беларусі гатовы да пачатку датэрміновага галасавання і ўжо атрымалі бюлетэні. Пра гэта прадстаўнікі выбаркамаў Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай абласцей і горада Мінска паведамілі старшыні Цэнтрвыбаркама Лідзіі Ярмошынай. Нарада адбылася ўчора падчас відэаканферэнцыі, арганізаванай у Палацы Рэспублікі, у інфармацыйным цэнтры ЦВК «Выбары-2016».**

З гатоўнасцю інфацэнтра да працы азнаёміўся **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ.** Размаўляючы з прадстаўнікамі СМІ, ён адзначыў, што Міністэрства інфармацыі і Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў у чарговы раз прадэманстравалі ўзровень і вопыт арганізацыі працы падобнага роду цэнтраў, што дазваляе ўзаемадзейнічаць з грамадскасцю ў асноўны электаральны дзень.

Ігар Бузоўскі выказаў упэўненасць, што ўсё будзе арганізавана на высокім узроўні, а грамадзяне краіны і журналісты атрымаюць магчымасць у поўнай меры авалодаць інфармацыяй пра падзеі, якія адбываюцца па парламенцкіх выбарах.

**Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ** падчас пасяджэння рабочай групы па стварэнні і забеспячэнні дзейнасці інфармацыйнага цэнтра Цэнтрвыбаркама «Выбары-2016» паведаміла, што амаль 700 журналістаў акрэдытаваны для працы ў інфацэнтры на парламенцкіх выбарах. Як адзначыла Лілія Ананіч, згенерыравана 800 лагінаў і пароляў для беспрацоўнага доступу да інтэрнэту, падрыхтаваны працоўныя месцы ў прэс-цэнтры, зацверджаны план-графік прэс-канферэнцый.

Кіраўнік ведамства акцэнтавала ўвагу, што ў малой канферэнц-зале інфацэнтра пройдуць два круглыя сталы — «Парламентарызм праз прызму ментальнасці беларускага грамадства» і «Сродкі масавай інфармацыі ў выбарчых працэсах фарміравання электаральнай культуры». Чакаецца, што ўдзел у іх прымуць беларускія і замежныя эксперты.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■

# ПА ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СТАНДАРТАХ

## Сёння пачынаецца датэрміновае галасаванне

**Працэдура датэрміновага галасавання прымяняецца не толькі ў Беларусі, але і ў многіх краінах свету. Гэта адпавядае міжнародным стандартам, у тым ліку рэкамендацыям Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ). Пра гэта нядаўна заявіла старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА.**

Каб забяспечыць чысціню вынікаў пры датэрміновым галасаванні, у прыватнасці, перад яго пачаткам у прысутнасці назіральнікаў урны для бюлетэняў апячатваюцца, прычым гэта робіцца штодзень, з подпісамі членаў камісіі. У канцы кожнага дня на выбарчым участку вывешваюць звесткі аб колькасці выдадзеных бюлетэняў.

«Усе гэтыя дадатковыя гарантыі сведчаць аб надзейнасці датэрміновага галасавання. Калі адмовіцца ад яго выбаршчыкаў і лічыць выбары адбыўшыміся пры любой яўцы, незалежна ад таго, колькі людзей прыйшло на ўчасткі, то тады можна адмовіцца і ад датэрміновага галасавання. Але каго выберуць гэтыя людзі? Мы можам прачнуцца ў іншай краіне, калі прагаласавала, напрыклад, 20% выбаршчыкаў», — сказала старшыня Цэнтральнай камісіі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

■ Вынікі тыдня



# ЦІ АТРЫМАЕЦЦА ПАЗБЕГНУЦЬ НОВЫХ КАНФЛІКТАЎ?

Галоўнай геапалітычнай падзеяй мінулага тыдня для краін СНД стала **смерць прэзідэнта Узбекістана Іслама Карымава**. Ён быў адным з самых вядомых палітыкаў рэгіёна і прыйшоў на сваю пасаду яшчэ з пасады савецкага кіраўніка рэспублікі, як і прэзідэнт Казахстана. Пры гэтым, калі Казахстан з'яўляецца эканамічным цэнтрам Цэнтральнай Азіі, у сілу багацця энергарэсурсаў, якія там здабываюць, то Узбекістан — цэнтр дэмаграфічны. У ім пражывае палова насельніцтва пяці былых азіяцкіх рэспублік былога СССР — больш за трыццаць мільёнаў чалавек. Бурны дэмаграфічны рост мінулых гадоў дрэнна спалучаўся з досыць складанай эканамічнай сітуацыяй у краіне, спараджаючы беспрацоўе, нізкія заробкі і эміграцыю маладых грамадзян у тыя краіны, дзе ёсць працоўныя месцы. У адной толькі Расіі цяпер жыве амаль два мільёны выхадцаў з Узбекістана. Краіна мае значныя рэсурсы мінералаў, але аб'ёмы іх здабычы недастатковыя, каб аказаць такі ж пазітыўны эфект на ўзровень жыцця ў краіне, як гэта адбываецца ў Расіі, Туркменістане і Казахстане.

Дзве галоўныя праблемы Узбекістана — мяжа з Афганістанам і недахоп водных рэсурсаў. Суседства з ахопленым вайной Афганістанам выклікае пастаянныя і цалкам абгрунтаваныя асцярогі, што ісламскі радыкалізм можа перакінуцца на Узбекістан. Калі гэта адбылося ў Таджыкістане, краіна была шмат гадоў ахоплена грамадзянскай вайной, у якой загінулі дзясяткі тысяч грамадзян, а сотні тысяч сталі ўцекачамі. Велізарная роля ў эканоміцы сельскай гаспадаркі, на думку ўлад Узбекістана, падрываецца планамі Кыргызстана і Таджыкістана па будаўніцтве велізарных ГЭС на рэках, па якіх ва Узбекістан паступаюць водныя рэсурсы. У сувязі з гэтым сітуацыя з суседзямі ва Узбекістана заўсёды была напружанай. У сілу названых фактараў для СНД вельмі важна, каб пераход улады ў краіне прайшоў мірна і новы прэзідэнт захаваў адносную стабільнасць. Мяркуючы па першых прыкметах, так яно і павінна адбыцца, паколькі ўзбекскія эліты разумеюць высокую цану, якую прыйдзецца заплаціць за неарганізаваны пераход улады. Адным з галоўных пытанняў з'яўляецца новы знешнепалітычны курс Узбекістана. Галоўнымі гульцамі па ўплыве на эліты Узбекістана будуць Расія, ЗША і Кітай, якія маюць значныя інтарэсы ў рэгіёне і прыхільнікаў унутры краіны. Але спроба трансфармаваць ранейшы роўнааддалены ад усіх трох цэнтраў курс Узбекістана на адну з краін натыкнецца на лютае супраціўленне двух астатніх сапернікаў.

**У кітайскім горадзе Ханчжоу прайшоў саміт «Вялікай дваццаткі».** Прымаючы бок зрабіў усё, каб саміт прадэманстраваў значнасць Кітая, якая ўзрасла ў свеце, запрасіўшы ў тым ліку на саміт лідараў Лаоса, Казахстана, Сінгапура, Чада, Сенегала і Егіпта. Асаблівую ўвагу атрымаў ад гаспадароў на саміце Уладзімір Пуцін, якую сусветныя СМІ супрацьпаставілі халоднаму прыёму для Барака Абамы. Зрэшты, ведаючы кітайскія традыцыі вядзення знешняй палітыкі, не варта думаць, што Расія цяпер будзе мець выключную ролю для Кітая. Хутчэй за ўсё такім чынам кітайцы далі зразумець амерыканцам, што яны вельмі незадаволеныя той палітыкай у дачыненні да Кітая і яго суседзяў, якая праводзіцца ЗША апошнія гады. Пра гэта можна меркаваць і па некаторых іншых аспектах. Так, на саміце G20, які па сваёй прыродзе з'яўляецца эканамічным, быў створаны для пераадолення азіяцкага крызісу канца 1990-х і набыў асаблівую папулярнасць у пачатку крызісу 2008 года, старшыня КНР Сі Цзыньпін падчас двухбаковай сустрэчы з прэзідэнтам Паўднёвай Карэі Пак Кын Хе выказаў незадаволенасць планамі па размяшчэнні на тэрыторыі краіны элементаў амерыканскай сістэмы супрацьракетнай абароны THAAD. Сама ж Расія таксама паспрабавала выкарыстаць саміт перш за ўсё ў палітычных мэтах, нягледзячы на заклік самога прэзідэнта Расіі перад самітам сканцэнтравацца на пытаннях эканомікі. Уладзімір Пуцін паспрабаваў наладзіць кантакт з новым прэм'ер-міністрам Вялікабрытаніі, палепшыць расійска-турэцкія адносіны і абмеркаваць сірыйскі канфлікт з Баракам Абамам.

Міністр замежных спраў Беларусі **Уладзімір Макей прыняў удзел у двух важных мерапрыемствах:** у нефармальнай міністэрскай сустрэчы АБСЕ, якая прайшла ў Патсдаме, і ў нефармальнай сустрэчы міністраў замежных спраў краін — членаў Еўрапейскага саюза і краін—удзельніц ініцыятывы ЕС «Усходняе партнёрства», якая прайшла ў Браціславе. У рамках першага мерапрыемства ён заклікаў партнёраў па АБСЕ да сумесных дзеянняў па аднаўленні жыццяздольнасці рэжыму кантролю над звычайнымі ўзбраеннямі ў Еўропе, гарманізацыі інтэграцыйных працэсаў і ўрэгулявання існуючых канфліктаў, уключаючы ўкраінскі крызіс. На другім мерапрыемстве Уладзімір Макей заклікаў Еўрасаюз да пачатку перамоў па базавым пагадненні паміж Беларуссю і ЕС.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук.**

# САМАЕ ХЛЕБНАЕ СВЯТА

## Абласныя дажынкі адсвяткавала Брэстчына



**Драгічын сустрэў гасцей сельскагаспадарчага фестывалю прыгожым і памаладзелым. Нездарма апошнія паўгода тут шчыравалі будаўнікі і камунальнікі. Кругом было шмат кветак, ад іх горад літаральна расцвіў. І гэта, без сумнення, паспрыяла святочнаму настрою. Як і лагоднае надвор'е: цёпла, але не горача.**

Для таго каб людзі змаглі культурна адпачыць, арганізатары прадугледзелі ўсё. Імправізаваныя кавярні вабілі смачнымі пахамі свежых страў і выпечкі. Шмат было салодкай прадукцыі. Мамы з малымі дзецьмі маглі пачаставацца каля многіх палатак, што і рабілі з задавальненнем. Для дзяцей, дарэчы, загадзя абсталявалі гульнявыя зоны, дзе малым прапаноўвалася змайстраваць нешта цікавае і пабыць пад наглядам. Гэты факт асабліва ацанілі госці свята.

— Мы з сынам прыехалі з Мінска да бацькоў, — расказала Алеся Саўчук, — і з вялікай цікавасцю гуляем па святочных вуліцах роднага горада. Наш Лёша нават пазаймаўся з аніматарам. А цяпер мы вывучаем меню вулічнай кавярні, каб разам паабедаць.

І сапраўды, выбіраць было з чаго. Першая ж шыльда, якая трапілася на вочы, запрашала пакаштаваць фасолеўку, панскі суп, дранікі, пячысту з палюшкамі, скрылькі і іншыя беларускія стравы. Цэны, трэба аддаць належнае, выглядалі даволі дэмакратычна. Людзі выбіралі прадукты, частаваліся, а некаторыя проста з цікавасцю разглядалі вітрыны, бо тыя нагадвалі арыгінальныя выстаўкі. А на сапраўдных выставах, напрыклад, вырабаў рамеснікаў, можна было паўдзельнічаць у майстар-класах, зрабіць сабе на памяць нейкую рэч. Ну а аматарам азарту прапаноўвалі згуляць у шашкі, дзе на дошцы замест шашак перасоўваліся... бляшанкі з тушонкай. Выйграў — забраў сабе.



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Анатоль ЛІС прымае сімвалічны сноп.

Вядома, гульні і забавы сталі толькі фонам для галоўнага зместу свята — шанавання герояў жніва. Пасля традыцыйнага шэсця па цэнтральнай вуліцы працаўнікі сельскагаспадарчай галіны занялі свае пачэснае месца ў першых радах перад сцэнай. На ганаровы подыум яны — у святочных касцюмах, перавязаныя чырвонай стужкай пераможцы — уздымаліся па атрыманне заслужаных узнагарод. Перадавікоў жніва, а таксама найлепшыя гаспадаркі, раёны-пераможцы прывітаў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС.** Губернатар агучыў лічбу валавога збору збажыны — 1 мільён 172 тысячы тон. Па ўраджайнасці Брэстчына заняла другую пазіцыю ў краіне — па 35,2 цэнтнера сабрана з кожнага гектара.

Па традыцыі ўзнагародзілі найлепшых хлебаробаў. У ліку самых першых герояў жніва ўшанавалі камбайнераў Уладзіміра і Андрэя Казімірчыкаў з птушкафабрыкі «Дружба» Баранавіцкага раёна, Артура Гутырчыка з сельгаспрадпрыемства «Белдан» Ляхавіцкага раёна, Сяргея Дворака і Дзмітрыя Макарушку з СВК «Фядорскі» Столінскага раёна.

— Гэта маё 27-е жніво, — сказаў у гутарцы з карэспандэнтам Сяргей Дворак. — Нямецкая «Мега-350», якая працуе 11-ты сезон, не падвяла, убралі з памочнікам больш за 300 гектараў. Добра, што надвор'е паспрыяла. У дзень ссыпалі ў бункер па 80 тон.

Сярод раёнаў адзнаку за жніво-2016 атрымалі Маларыцкі, Брэсцкі і Камянецкі, а сярод сельгаспрадпрыемстваў — СВК «Святая Воля» Івацэвіцкага раёна, ААТ «Агра-Кобрынскае» Кобрынскага раёна, ААТ «Белавежскі» Камянецкага раёна.

Гараджане і госці не шкадавалі апладысментаў пераможцам і радаваліся за свой горад. Бо дажынкі каштоўныя тым, што пасля свята гаспадарам застаецца шмат чаго адрэстаўраванага, пабудаванага, абноўленага. Так і ў Драгічыне ў перыяд падрыхтоўкі значна абноўлены цэнтральныя вуліцы і дарогі. Рэканструкцыю перажылі Дом культуры, бальніца, дзве сярэднія школы, гімназія, два дзіцячыя садкі, стадыён спартыўнай школы. Рэканструяваны гарадскі парк. Менавіта ў парку праходзіў рэгіянальны этап сямейнага праекта «Уладар сяла». Цягам дня ўдзельнікі конкурсу знаёмілі гледачоў і журы са сваімі сем'ямі, праяўлялі спрыт, вынаходлівасць, спрактыкаванасць. Пераможцамі стала сям'я Дзмітрыя і Людмілы Улога з Пружанскага раёна.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*




# ПАЧАЛАСЯ ЎБОРКА БУЛЬБЫ І КУКУРУЗЫ

**У краіне завяршылася ўборка збожжавых і зернебабовых культур. Паводле аператыўных даных Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання на 5 верасня, прыбрана з палёў 6,9 млн тон збожжа. Сярэдняя ўраджайнасць склала 33,4 ц/га.**

Больш за ўсё збожжа ўбрана на Міншчыне — 1,7 мільёна тон. Найбольшая ўраджайнасць была ў Гродзенскай вобласці. Аднак на гэтым уборачная кампанія яшчэ далёкая ад завяршэння. Аграрыі Віцебскай вобласці пачалі ўборку кукурузы. Кукурузу на зялёны корм убіраюць прадстаўнікі 8 раёнаў вобласці. Тэхніка прайшла каля 1 тысячы з 72 тысяч га пасяўных плошчаў. Ураджайнасць складае 330 ц/га, што вышэй за леташні паказчык практычна ў два разы. Таксама клубні бульбы ўжо выкапаны на 18% плошчаў, пры гэтым з аднаго гектара ў сярэднім па вобласці збіраюць па 387,6 цэнтнера. Прыбаўка да ўзроўню мінулага года складае каля 20 цэнтнераў. Акрамя таго, усе раёны вобласці пачалі сеяць азімыя збожжавыя. Гэтыя работы выкананы на 9% плошчаў. Аграрыям вобласці гэтай восенню трэба будзе засеяць больш за 231 тысячу га.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

■ Падзея

**Андрэй РАЎКОЎ:**

# «У КРАІНЕ НАДЗЕЙНА ЗАХОЎВАЮЦЦА МІР І СТАБІЛЬНАСЦЬ»



Фота Ірыны МАЛІНОЎСКАЙ.

**У мінулую суботу на пляцы Ваеннай акадэміі было па-асабліваму ўрачыста. У гэты дзень словы ваеннай прысягі вымавілі каля 500 чалавек. Свой выбар на карысць афіцэрскай прафесіі сёлета зрабілі выпускнікі Мінскага сувораўскага ваеннага вучылішча, кадэцкіх вучылішчаў, ваеннаслужачыя Узброеных Сіл, цывільная моладзь.**



— Сёння Рэспубліка Беларусь — суверэнная, незалежная дзяржава, у якой надзейна забяспечаны мір і стабільнасць на фоне разрастання тэрарызму, шматлікіх войнаў і канфліктаў, — зазначыў **міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ.** — У гэтым Беларусь паказвае прыклад, як трэба абараняць нацыянальныя інтарэсы і захоўваць галоўныя каштоўнасці народа. На вас, дарагія першакурснікі, у гэты ўрачысты дзень ускладаецца, а дакладней ужо ўскладзена, найвышэйшая адказнасць — надзейна забяспечыць мір на нашай зямлі і надалей. Менавіта вы, будучыя афіцэры, з'яўляецеся будучыняй Узброеных Сіл. Вам працягваць традыцыі пакалення, якое заваявала для нас Перамогу, забяспечыла на доўгія гады мір і спакой на нашай зямлі.

Як расказалі ў Ваеннай акадэміі, ахвотнікаў надзець курсанцкія пагоны сёлета было дастаткова шмат. Але конкурсныя выпрабаванні ўжо ў мінулым, як і курс маладога байца, які на працягу месяца знаёміў курсантаў-першакурснікаў з вайсковай службай. Толькі баявую падрыхтоўку, якая доўжылася на працягу месяца, прайшлі не ўсе. Каля 30 чалавек не справіліся з гэтай задачай і па ўласным жаданні пакінулі сцены акадэміі. Але самае цікавае, што з 12 дзяўчат, якія сёлета паступілі ва ўстанову, ніводная не сышла з дыстанцыі. Гэта толькі пацвярджае правільнае рашэнне Міністэрства абароны, якое сёлета аднавіла набор дзяўчат у галоўную ваенную ВНУ краіны. Падрыхтоўка афіцэраў-жанчын будзе ажыццяўляцца на агульнавайсковым факультэце, на факультэце сувязі і аўтаматызаваных сістэм кіравання, на інжынерных спецыяльнасцях авіяцыйнага факультэта.

Курсантам апошняга пашчасціла стаць і Ілоне Сурме з Дзятлаўскага раёна. Як прызналася дзяўчына, стаць афіцэрам яна марыла з дзяцінства, і нават высокі конкурс (а на спецыяльнасці, на якія набіралі дзяўчат, ён быў яшчэ большым) яе не спалохаў. «Вайскоўцаў у сям'і ніколі не было, і я вырашыла, што яны абавязкова будуць», — рэзюмавала курсантка. А вось Ягор Амельчанка вырашыў працягнуць ваенную дынастыю сям'і, пайсці па слядах свайго бацькі, які служыць у 116-й гвардзейскай штурмавой авіябазе ў Лідзе. Як перакананы новаспечаныя курсанты, нашмат цікавей вучыцца тут, чым у любым іншым універсітэце. І самае галоўнае, што, нават прайшоўшы праз усе выпрабаванні першага месяца навучання, яны не расчараваліся ў выбранай прафесіі.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■

■ Надвор'е

# ЛЕТА ВЯРТАЕЦЦА

## Спецыялісты прадказваюць, што тэмпературны фон будзе на 3—5 градусаў вышэйшы за норму

**Начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ паведамляе, што на гэтым тыдні на тэрыторыі краіны пачне гаспадарыць цёплае і сухое надвор'е.**

Цяпер актыўныя атмасферныя франты, якія прынеслі ў Беларусь дажджы рознай інтэнсіўнасці, адыходзяць на ўсход, а на змену ім з боку Заходняй Еўропы распаўсюджваецца зона павышанага атмасфернага ціску. Таму сінаптычнае лета на гэтым тыдні ў нас працягваецца. Ужо ў аўторак будзе пераважна без ападкаў. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 19—25 градусаў. Не прагназуюць сіноптыкі нейкіх істотных ападкаў і ў сераду. Тэмпература паветра ўначы на сераду складзе плюс 5—12 градусаў, а ўдзень чакаецца ад 18 да 24 цяпла, па паўднёвым захадзе — да плюс 26 градусаў.

Не будзе сур'ёзных ападкаў і ў чацвер, толькі ўдзень па паўночным усходзе краіны магчымы невялікія дажджы. Мінімальная тэмпература паветра ўначы на чацвер будзе зніжацца да 7—14 цяпла, удзень — плюс 18—24 градусы, а па паўднёвым захадзе прагназуецца да плюс 27 градусаў. Умерана летняе надвор'е абяцаюць сіноптыкі на чацвер. Будзе пераважна без ападкаў, але па паўночным усходзе яшчэ захаваецца верагоднасць кароткачасовых дажджоў. Тэмпература паветра ўначы будзе складаць ад 7 да 15 цяпла, а ўдзень сонейка будзе прыпякаць да плюс 18—25 градусаў, а па паўднёвым захадзе — да 28 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, на выхадныя ў Беларусі захаваецца цёплае, спакойнае і камфортнае надвор'е. Будзе пераважна без ападкаў. Стане нават крыху цяплей, калі ўначы мінімальная тэмпература паветра будзе не ніжэйшай за плюс 8—15 градусаў. Удзень чакаецца ўжо плюс 19—26 градусаў, а па паўднёвым захадзе — да 28 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■

# Ігар КАТЛЯРОЎ:
# «ТРЭБА, КАБ ЗАПОМНІЛІ ТВАЁ ПРОЗВІШЧА»

**Выбары — гэта «лакмусавая паперка» палітычнай актыўнасці насельніцтва. Але зацікаўленасць электарату залежыць і ад ініцыятыўнасці кандыдатаў у дэпутаты. Пра тое, чага чакаюць беларусы ад будучых парламентарыяў і як сёння працуюць цэнтры па сацыялагічных даследаваннях, мы пагаварылі з дырэктарам Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі Ігарам КАТЛЯРОВЫМ.**


Фота БЕЛТА.

## Перавагі і недахопы

***— Якія даследаванні праводзіліся Інстытутам сацыялогіі НАН па палітычнай актыўнасці?***

— Да пачатку рэгістрацыі кандыдатаў мы падвялі вынікі даследавання, згодна з якімі крыху менш за 2/3 насельніцтва ведаюць нешта пра выбары і гатовыя прымаць у іх удзел. Трація насельніцтва практычна нічога не ведае, і гэта ставрае пэўныя цяжкасці. Але ў той час, у ліпені, яшчэ не было вялікай палітычнай актыўнасці кандыдатаў, паколькі агітацыйны этап яшчэ не пачаўся. Выбары сёлета дастаткова цікавыя тым, што зарэгістравана шмат кандыдатаў у дэпутаты ў кожнай выбарчай акрузе. І ў той жа час ёсць праблемы, якія трэба вырашаць.

***— У гэтым годзе 63,6% зарэгістраваных кандыдатаў вылучаліся ад палітычных партый. Ці добры гэта паказчык?***

— Гэта самы просты спосаб вылучэння. З'езд вылучае людзей, якія хочуць, а можа быць, не хочуць быць кандыдатамі ў дэпутаты. Зараз ужо адмовіліся нават некаторыя кандыдаты, якія былі зарэгістраваныя. Тое, што сёння 2/3 кандыдатаў у дэпутаты вылучаны ад палітычных партый, з аднаго боку, добра, таму што партыя — гэта вельмі важны суб'ект палітычных дзеянняў. Яны павінны развівацца і вырашаць многія праблемы. Але ў той жа час аналіз нашых даследаванняў паказвае, што за час перадвыбарнай кампаніі рэйтынг палітычных партый практычна не вырас. Мы задавалі пытанне: калі будуць выбары ў найбліжэйшы час па прапарцыянальнай выбарчай сістэме, гэта значыць па партыйных спісах, за якую з палітычных партый вы будзеце галасаваць? І ў выніку вызначылі, што партыя, якая зойме першае месца, атрымае толькі 2,2% галасоў. Тут варта адзначыць, што партыі практычна не працавалі ў ліпені. Хоць гэта рэальна. Выбарчая агітацыя забароненая, але ў той жа час можа працаваць група падтрымкі, якая будзе прасоўваць ідэі палітычнай партыі. Я 13 гадоў быў дэпутатам парламента. Тройчы вылучаўся. І мая група ў Пухавіцкім раёне актыўна працавала ўсе два месяцы.

Такая сітуацыя — гэта вялікая праблема нашай выбарчай сістэмы: як правіла, тыя людзі, якія не з'яўляюцца актыўнымі палітычнымі суб'ектамі, вылучыліся ў кандыдаты ў дэпутаты ад палітычных партый. Яны не маюць ні досведу, ні нават жадання. У любым выпадку яны будуць працаваць, прасоўваць свае ідэі, павышаць рэйтынг партый. Але пасля апошніх прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбараў рэйтынг практычна не павысіўся. Гэта сведчыць аб тым, што, на жаль, нашы партыі не змаглі эфектыўна выкарыстаць такую магчымасць.

***— Даволі часта на выбарах перамагаюць беспартыйныя кандыдаты. З чым звязана гэтая тэндэнцыя?***

— З аднаго боку, гэта перавага мажарытарнай выбарчай сістэмы і яе ж буйны недахоп. Людзі галасуюць у сваёй тэрытарыяльнай акрузе за канкрэтнага чалавека, а ён павінен будзе адказаць за тое, што ён абяцаў. Я ўжо 8 гадоў не дэпутат, але ўсё роўна да мяне звяртаюцца, каб вырашыць тыя ці іншыя праблемы. І гэта галоўная перавага мажарытарнай выбарчай сістэмы: ты галасуеш за канкрэтнага чалавека. У той жа час гэта самы галоўны недахоп, таму што, як правіла, гэтыя людзі вядомыя. Напрыклад, настаўнікі, дырэктары школ, урачы, паштальёны. Яны не з'яўляюцца прафесійнымі палітыкамі і стануць імі не надта хутка. Пажадана, каб людзі былі гатовыя да выбарчай барацьбы, працы ў парламенце.

Ёсць яшчэ адзін момант: Саветы мясцовых узроўняў, дзе вучаць гэтай працы. Крыху менш за палову кандыдатаў сёння з'яўляюцца дэпутатамі мясцовых Саветаў розных узроўняў. Мы праводзілі вялікія даследаванні па заданнях Савета Рэспублікі і звярнулі ўвагу, што пасля таго, як Міхаіл Мясніковіч стаў старшынёй верхняй палаты і пачаў плённа працаваць, рэйтынг дэпутатаў мясцовых Саветаў вырас. Цікава потым будзе паглядзець, ці былі дэпутатамі мясцовых Саветаў тыя людзі, якія перамогуць у сённяшніх парламенцкіх выбарах. Хацелася б, каб усе кандыдаты мелі вопыт працы на гэтым узроўні.

## Дастукацца да выбаршчыка

***— Як уяўляюць выбаршчыкі ідэальнага кандыдата ў дэпутаты?***

— Мы не праводзілі такога даследавання, таму што пры мажарытарнай выбарчай сістэме вынікі не апраўдваюцца. Калі ў акрузе ёсць цікавы нават не палітык, а гаспадарчы дзеяч, дырэктар ці старшыня калгаса, то людзі не асабліва будуць звяртаць увагу, напрыклад, пенсіянер ён ці малады. Але звычайна людзям важна, каб ён меў вышэйшую адукацыю. Адразу ўзнікаюць пытанні, чаму чалавек, які не вучыўся ў ВНУ, ідзе ў парламент, хоць у маю бытнасць былі і такія дэпутаты.

***— Які спосаб палітычнай барацьбы вы параіце выкарыстоўваць дэпутатам, каб яны зацікавілі больш выбаршчыкаў?***

— Самы эфектыўны метад — гэта «метад жабракоў»: ад кватэры да кватэры. Ён дае вельмі добрыя вынікі. Я заўсёды кажу: калі табе адчынілі дзверы і ты расказаў сваю праграму — гэта 50%, што за цябе прагаласуюць. Калі цябе пачаставалі кавай — гэта ўжо 70%. Калі каньяком — 99%. У раёнах так працаваць прасцей. У Мінску гэта вельмі складана, напрыклад, да мяне ніхто ніколі не дастукаўся. Табе не адчыняць дзверы яшчэ ўнізе, таму што там стаіць дамафон. Але неабходна тады ўкідваць лістоўкі ў паштовыя скрыні. У іх трэба пазначыць прозвішча, некаторыя звесткі і дадаць фотаздымак. Абавязкова — слоган. У мяне быў слоган, які і цяпер памятаюць: «Калі хочаш быць здаровым — галасуй за Катлярова». Калі ты першы раз у жыцці прыязджаеш кудысьці да выбаршчыкаў, трэба, каб хаця б запомнілі тваё прозвішча. Гэтыя маленькія ўлёткі прымушаюць чалавека звярнуць увагу на канкрэтнага кандыдата ў дэпутаты. Яшчэ адзін момант — гэта сустрэчы з выбаршчыкамі. Пажадана ў двары ля пад'езда. Як правіла, на сустрэчы ў нейкім пэўным месцы людзі не ідуць. А калі ты пачынаеш побач з імі гаварыць аб праблемах, якія хвалююць, на цябе звяртаюць увагу.

Сёння многія выкарыстоўваюць пікеты. Але гэта абсалютна нулявы варыянт, асабліва ў Мінску, дзе, можа, 3–4% тваіх выбаршчыкаў пройдуць побач і звернуць увагу. За выключэннем дробнай інфармацыі для электарата, гэта нічога не дае. Таму пікеты, думаю, неэфектыўныя, як і інтэрнэт. Першы момант: сёння ўзровень даверу да сусветнага сецціва ніжэйшы, чым да іншых сродкаў масавай інфармацыі, да таго ж, як правіла, тыя, хто карыстаецца інтэрнэтам, шукаюць сайты, якія не тычацца палітыкі. Зноў жа ў нас амаль 500 кандыдатаў у дэпутаты. Каб інтэрнэт-карыстальнік выйшаў на канкрэтнага дэпутата, трэба, каб ён ведаў яго прозвішча. Значыць, гэты чалавек ужо вызначыўся.

Лічу, што народ будзе выбіраць тых людзей, чыя праграма адпавядае іх асабістым патрабаванням. Яна павінна быць канкрэтнай, накіраванай на рашэнне праблем і дзяржавы ў цэлым, і выбарчай акругі.

## Слова народа

***— Не так даўно адбылося рэзананснае расследаванне журналістаў наконт існавання НІСЭПД. Што вы аб гэтым думаеце?***

— У нас ёсць Камісія па апытаннях грамадскай думкі пры Нацыянальнай акадэміі навук. Яна акрэдытоўвае тыя сацыялагічныя структуры, якія займаюцца вывучэннем выбараў, рэферэндуму і сацыяльна-палітычнай сітуацыі. У гэтую камісію ўваходзяць самыя вядомыя сацыёлагі ў краіне, а я з'яўляюся старшынёй. Мы некалькі разоў афіцыйна папярэдзілі НІСЭПД, што яны павінны правесці акрэдытацыю свайго інстытута. Прычым, паколькі ён знаходзіцца, як сцвярджаецца, у Літве, мы накіравалі гэтыя дакументы ў Вільнюс. Некалькі разоў яны вярталіся, таму што па гэтым адрасе такі інстытут не існуе, а некалькі разоў засталіся без адказу. Потым мы ўжо перасталі гэта рабіць, таму што ніякай сувязі не было. Акрамя гэтага, заўсёды, калі праводзяцца даследаванні, наша сацыялагічная служба сустракаецца з сеткамі іншых сацыялагічных структур, якія працуюць у гэтым рэгіёне. У дадзеным выпадку ніколі ў жыцці мы з імі не бачыліся. Члены камісіі і мы, супрацоўнікі Інстытута сацыялогіі, прыйшлі да высновы, што гэты інстытут — фантом. Ён выконвае пэўныя палітычныя заказы. Верыць гэтым даследаванням практычна немагчыма.

***— НІСЭПД выкладваюць усе вынікі даследаванняў на свой сайт. А даследаванні зарэгістраваных сацыялагічных службаў часам даволі складана знайсці. У чым справа?***

— У нашага Інстытута сацыялогіі ёсць свой сайт, мы на яго выкладваем звесткі. Робім гэта з пэўным спазненнем, таму што вынікі даследаванняў — інтэлектуальная уласнасць нашага інстытута. Раз на год мы выпускаем сацыялагічны альманах. Мы робім яго галоўным навуковым зборнікам. Плюс, як правіла, мы публікуем свае звесткі, за выключэннем тых, якія нам не належаць, ва ўсіх часопісах. Напрыклад, цяпер мы правілі вялікае даследаванне аб фінансавай культуры. Гэтыя вынікі належаць Нацыянальнаму банку. Мы ўжо не маем права іх публікаваць.

У пазамінулым годзе мы правялі велізарнае даследаванне. Першае на постсавецкай прасторы, а можа, нават адзінае ў свеце. Яно называецца «Беларусь-2030». Мы адразу выдалі манаграфію. У ёй усё, што тычыцца гэтага вялікага даследавання. Мы паставілі задачу вывучыць, якой будзе Беларусь праз 15—20 гадоў. Прычым сацыялогія не займаецца прагнозамі. Гэта першая методыка такога кшталту.

> **«Калі табе адчынілі дзверы і ты расказаў сваю праграму — гэта 50%, што за цябе прагаласуюць. Калі цябе пачаставалі кавай — гэта ўжо 70%. Калі каньяком — 99%».**

Нядаўна мы скончылі даследаванне пра цывілізацыйны код беларускага грамадства. Яно тожа адзінае ў свеце. Ёсць тэарэтычныя, філасофскія даследаванні на гэты конт. А гэта будзе першае даследаванне, калі пры дапамозе сацыялагічных даных мы пастараемся вызначыць цывілізацыйны код беларускага грамадства. Пэўныя звесткі мы выкладзем на сайт Інстытута. А потым да канца гэтага года будзе выдадзена кніга.

Вялікая праблема ў тым, што ўсё залежыць ад таго, каму належаць гэтыя сацыялагічныя даныя. Плюс да гэтага, пакуль іх не апублікуюць дзесьці ў артыкуле, мы на сайт не выкладваем, таму што гэта інтэлектуальная ўласнасць. НІСЭПД усё публікуюць, прычым зусім не зразумела, адкуль яны іх бяруць.

***— Сучасныя тэхналогіі дазваляюць рабіць даследаванні анлайн, праз інтэрнэт?***

— Рэпрэзэнтатыўныя даследаванні зрабіць такім чынам практычна немагчыма. У інтэрнэце знаходзіцца толькі пэўны сегмент беларускага грамадства. Але мы паставілі задачу распрацаваць такую методыку. Прынамсі, такая праца ў Інстытуце вядзецца. Мы ўжо некалькі разоў паспрабавалі — нас гэта не задаволіла. У прынцыпе, з інтэрнэтам можна працаваць, асабліва па нейкіх вузкіх пытаннях. Але пакуль дакладную інфармацыю атрымаць практычна немагчыма.

**Надзея АНІСОВІЧ**

# ЗГОДНЫ НЕ З УСІМ

## ЦВК заяўляе аб недакладнасці ў прамежкавай справаздачы БДІПЧ АБСЕ

**Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў выказала заўвагі наконт недакладнасці ў прамежкавай справаздачы місіі БДІПЧ АБСЕ аб выбарах у Палату прадстаўнікоў. Пра гэта ў эфіры праграмы «Актуальны мікрафон» Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё заявіла старшыня Цэнтральнай камісіі Лідзія ЯРМОШЫНА.**

У прамежкавай справаздачы маніторынгавай місіі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ, у прыватнасці, гаворыцца, што «міжнародныя і мясцовыя назіральнікі не заўсёды мелі магчымасць у поўнай меры назіраць працэс рэгістрацыі кандыдатаў». Па стане на сёння, ад БДІПЧ АБСЕ для маніторынгу выбараў у ніжнюю палату нашага парламента акрэдытавана найбольшая колькасць замежных назіральнікаў — 341.

Лідзія Ярмошына адзначыла, што высновы маніторынгавых місій аб парламенцкіх выбарах будуць прадстаўлены 12 верасня. «Зараз робіцца ўзор, складаецца тэкст заявы, якую зробяць місіі і якая характарызуе ўвесь перыяд выбарчай кампаніі. Аднак я магу сказаць, што не з усім тым, што сказана, напрыклад, у справаздачы місіі АБСЕ, мы згодныя. І мы ўжо зрабілі заўвагу», — сказала старшыня Цэнтральнай камісіі.

Па словах старшыні Цэнтрвыбаркама, у прамежкавай справаздачы БДІПЧ АБСЕ, якая была апублікавана некалькі дзён таму, сказана, што ўдзельнікі маніторынгу не заўсёды мелі магчымасць бачыць працэс рэгістрацыі прэтэндэнтаў на парламенцкі пост. Лідзія Ярмошына падкрэсліла, што гэта не адпавядае рэчаіснасці, паколькі рэгістрацыя здзяйсняецца на пасяджэнні камісіі, дзе прысутнічаюць назіральнікі.

«Яны блытаюць два паняцці (і, дарэчы, выпраўляць не збіраюцца): лічаць, што падрыхтоўка да рэгістрацыі (праверка дакументаў) — гэта таксама рэгістрацыя. Яны лічаць, што дакументы павінны правяраць не члены камісіі, не эксперты, а менавіта назіральнікі. Гэта, натуральна, невыканальна, таму што дакументы, пададзеныя кандыдатамі, правяраюць прафесіяналы», — патлумачыла Лідзія Ярмошына.

Напрыклад, даходы вывучае падатковая інспекцыя, пашпартныя звесткі — Міністэрства ўнутраных спраў і гэтак далей. «З гэтага працэсу выключаны чалавечы фактар у выглядзе выбарчых камісій, — адзначыла старшыня Цэнтральнай камісіі. — Таму тут мы ніколі не пагодзімся з міжнароднымі назіральнікамі, бо назіранне ахоплівае і павінна ахопліваць толькі сферу дзейнасці выбарчых камісій і праваадносіны менавіта ў гэтай галіне. Назіранне не можа тычыцца дзейнасці дзяржаўных арганізацый, якія нясуць адказнасць і маюць на сваім балансе адпаведную базу даных».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

# Экскурс у гісторыю выбарчага права

**Выстаўка «Гісторыя станаўлення выбарчага права на беларускіх землях» адкрыецца 6 верасня ў Беларускім дзяржаўным універсітэце (вул. Бабруйская, 5а, будынак рэктарата).**

Кампазіцыйна выстаўка падзелена на чатыры тэматычныя часткі. У першай будуць прадстаўлены ранніяя прадметы, якія адносяцца да перыяду Полацкага княства, у тым ліку і копіі першых заканадаўчых дакументаў таго перыяду.

Асаблівае месца адведзена Вялікаму Княству Літоўскаму. У гэтую экспазіцыю ўвойдуць усе рэдакцыі Статута — асноўнага прававога зводу гэтай усходнееўрапейскай дзяржавы. Акрамя таго, тут будуць прадстаўлены партрэты палітычных дзеячаў Вялікага Княства Літоўскага і копіі дакументаў, якія пацвярджаюць атрыманне беларускімі гарадамі Магдэбургскага права. Гісторыя выбараў эпохі БССР будзе адлюстравана праз наглядныя матэрыялы: агітацыйныя плакаты, бюлетэні, выбарчыя дакументы, пасведчанні і нагрудныя знакі народнага дэпутата Беларускай ССР. Сучасны перыяд выбарчай сістэмы — гэта вялікі пласт кніжнай літаратуры, навучальных дапаможнікаў і даследаванняў, прысвечаных вывучэнню нарматыўных асноў выбараў. Працягне сучасную тэму дэманстрацыя выдадзеных у розны час рэдакцый Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Выстаўка будзе працаваць да 11 верасня ўключна. Наведванне бясплатнае па папярэднім запісе (тэл. 210 48 36).

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Ёсць ідэя!

# «АРТ-САЛАТА» Ў САЛАЦЦІ

## ЯК МАСТАКІ ЎПРЫГОЖВАЮЦЬ ВЁСКУ

**«Пізанскую вежу», «касмічны карабель — лятаючую талерку», катар «Упарты», «Святога Губерта», розных жывёл, птушак і многія іншыя арт-аб'екты можна ўбачыць у вёсцы Салацце Гродзенскага раёна і яе наваколлі. Гэты, здавалася б, не надта перспектыўны населены пункт на беларуска-літоўскай мяжы ўпадабалі творчыя людзі — мастакі, дызайнеры, архітэктары, якія ладзяць тут свае пленэры пад назвай «Арт-салата».**

Пра мастацкія «цікавінкі», што з'явіліся ў Салацці, карэспандэнту «Звязды» расказаў наш даўні чытач і аўтар, **дацэнт Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, кандыдат тэхнічных навук Сяргей ЛАДУЦЬКА.** Сяргей Мікалаевіч — заўзяты грыбнік, але цяпер гэтыя мясціны прывабліваюць яго не толькі дарамі лесу. На чыгуначным прыпынку Салацце (ад Гродна — 36 кіламетраў) ён сыходзіць з цягніка не толькі з кошыкам для грыбоў, але і з фотаапаратам. Фотасесію можна распачынаць тут жа, каля прыпынку, а прадоўжыць у вёсцы і навакольным лесе, дзе таксама ёсць мастацкія творы. Прычым іх становіцца ўсё больш (цяпер ужо каля трыццаці), а палатном для большасці паслужылі... шпулі ад кабелю. Убачыць усё гэта можа кожны, прыехаўшы цягніком, машынай альбо веласіпедам. Акрамя жадання, патрэбен толькі пропуск у пагранзону, які аформіць няцяжка.

Вось што расказаў аўтару гэтых радкоў адзін з ініцыятараў «Арт-салата», **гродзенскі мастак Алесь СУРАЎ:**

— Пачалося з таго, што я задумаў зрабіць сваю майстэрню дзесьці ў вёсцы. Салацце зачаравала перш за ўсё навакольнымі лясамі, падобнымі на тыя, сярод якіх прайшло маё дзяцінства на Брэстчыне. Купіў там дом, запрашаў пагасцяваць сяброў, калег-мастакоў. Многім з іх так спадабаліся гэтыя мясціны, што яны таксама сталі купляць дамы — часам паўразбураныя, нікому не патрэбныя. Такім чынам утварылася цэлая суполка накшталт арт-вёсак, якія я бачыў у Германіі: мастакі там селяцца, маюць майстэрні, нават галерэі, і там пачынаецца арт-жыццё. Вось аднойчы і мы задумаліся: а ці не здзейсніць нам у Салацці нейкую творчую акцыю? Вырашылі зрабіць пленэр. Тым больш што каваль Юрась Мацко, які таксама пасяліўся ў гэтай вёсцы, прывёз вялікую колькасць шпуляў ад кабелю. Меркавалася, што на дровы, але ўзнікла ідэя выкарыстаць іх для пленэра.

***— Якую тэму пленэра вызначылі?***

— Спачатку мы сапраўды гаварылі пра нейкія тэмы. Але потым ухвалілі маю прапанову назваць пленэр «Арт-салатам». Не толькі сугучна назве вёскі, але і ў сэнсе мастацкага «салата», дзе ёсць розныя «інгрэдыенты». Гэта дазваляе мастаку свабодна тварыць, няма нейкага навязвання тэмы. Паглядзець на гэтыя шпулі — кожная нечым адметная. Мы іх потым не толькі ў вёсцы пакінулі, але і развезлі па наваколлі ў радыусе каля сямі кіламетраў, нават на лясных дарогах размясцілі. Пры гэтым прытрымліваемся абавязковага правіла, каб створанае намі гарманічна ўпісвалася ў тутэйшы ландшафт. Усе неабходныя пытанні, вядома ж, узгаднены з сельсаветам, дарожнай і іншымі службамі, што тычыцца пагранзоны — з пагранічнікамі.

Мы вырашылі ладзіць такі пленэр штогадова і сёлета, калі кінулі кліч, зацікаўленасць была вялізная. У Салацце прыехалі не толькі гродзенцы, мінчане, але і два мастакі з Англіі і Расіі. Усе працуюць бясплатна, а расходы на матэрыялы для пленэру, пражыванне і харчаванне ўдзельнікаў бяруць на сябе бізнесмены, якія жывуць у нашай вёсцы.

Інфармацыя пра «Арт-салату» шырока распаўсюдзілася праз інтэрнэт сярод мастакоў, і многія вельмі зацікавіліся. Мы нават атрымалі прапанову аб сумесным праекце з Францыі, дзе таксама ёсць падобная вёска. Магчыма, французскія мастакі прыедуць на пленэр да нас, а мы — да іх.

Зрэшты, пленэр — гэта не толькі рэалізацыя той ці іншай творчай задумы ў Салацці. Падчас яго з'яўляюцца ідэі артпраектаў і ў іншых месцах, а на заканчэнне ладзім канцэрт — з'язджаюцца людзі нават з суседніх населеных пунктаў.

***— А як успрынялі «Арт-салату» карэнныя жыхары Салацця?***

— Яны ўхвалілі гэтую ідэю, бо мы нічога не разбураем, не псуем, а ствараем нешта новае, цікавае. Што, дарэчы, робіць Салацце









Фота Сяргея ЛАДУЦЬКІ.

вядомым не толькі ў наваколлі. Нават велатуры былі з Гродна, каб убачыць, якімі могуць стаць звычайныя шпулі і драўляныя паддоны. І машынамі, цягніком прыязджаюць — глядзяць, фатаграфуюць. Нідзе не бачыў, каб хтосьці нешта сапсаваў ці кепскае напісаў.

***— Ці даўгавечнымі будуць гэтыя работы пад адкрытым небам?***

— Тут важнейшая сама акцыя, чым даўгавечнасць створанай работы. Захаваецца на дзясятак гадоў — добра. Нешта зламае навальніца — не страшна, зробім штосьці новае. Дарэчы, шпулі сваю місію ўжо выканалі і ў далейшым мяркуем выкарыстоўваць іншыя матэрыялы — дрэва, бетон, метал. Наступны пленэр хочацца зрабіць такім, каб мастацкія творы былі як элемент зоны адпачынку — з лаўкамі, столікамі, навесамі. Прычым не тыповымі, а ў дызайнерскім, эксклюзіўным выкананні. Ідзе, напрыклад, чалавек у лесе па грыбы — сеў перакусіць ці ад дажджу схаваўся. Можа, нешта цікавае зробяць разьбяры па дрэве, кавалі. Ахвотнікаў паўдзельнічаць у «Арт-салаце» шмат, і ва ўсіх ёсць творчы азарт.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*

*Гродзенскі раён*

■ Экалагічны лікбез

# Адпачываць, а не парушаць і шкодзіць

**Сярод аматараў актыўнага адпачынку ў нашай краіне нямала тых, хто любіць бавіць свой вольны час найперш з вудай на беразе вадаёма або са стрэльбай у лясных угоддзях. Выбіраючыся на прыроду ад гарадской мітусні, некаторыя з іх пакідаюць дома не толькі будзённыя жыццёвыя праблемы, але, на жаль, часам і культуру паводзін. Я ж на адпачынку! Я здабытчык! Такая пазіцыя нярэдка вядзе да парушэнняў правілаў палявання і рыбалоўства, што, у сваю чаргу, можа стаць прычынай адміністрацыйнай або крымінальнай адказнасці. Спецыялісты Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь папярэджваюць аб недапушчальнасці такіх паводзін.**

## ШТО, КАЛІ ЗАМЕСТ ВЫДРЫ — БАБЁР?

У адпаведнасці з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, у краіне з пачатку месяца дазволена здабыча бабра і выдры. Нагадаем, што паляваць на гэтых жывёл можна ў светлы час сутак як зброевым (з засады, з падыходу), так і бяззброевым спосабам. Спецыялісты Дзяржінспекцыі прааналізавалі пытанні, якія найбольш часта задаюць паляўнічыя ў сувязі з гэтым і найперш звяртаюць увагу, што паляванне на бабра і выдру, як і на іншыя нармаваныя віды, дазволена ва ўсе дні тыдня.

Разам з тым, згодна з часткай 4 пункта 117 Правілаў палявання, карыстальнікі паляўнічых угоддзяў могуць скарачаць устаноўленыя імі тэрміны (у тым ліку дні тыдня, дазволеныя для правядзення палявання), а таксама абмяжоўваць або забараняць прымяненне прылад і (або) спосабаў палявання. Пра падобныя абмежаванні або забароны карыстальнік паляўнічых угоддзяў абавязаны праінфармаваць паляўнічага пры выдачы яму дазволаў на здабычу паляўнічай жывёлы і пуцёўкі да іх.

Падчас бяззбройнага палявання на бабра і выдру можна выкарыстоўваць прахадныя пасткі, прызначаныя па сваіх тэхнічных характарыстыках для лоўлі жывёл (напрыклад, КП-250 або КП-320). Такія прылады палявання адносяцца да так званых «гуманных» — яны забяспечваюць хуткую здабычу жывёлы без працяглых пакут, чаго нельга сказаць пра больш распаўсюджаныя ўшчамляльныя (якія захопліваюць ногі) пасткі.

Устаноўленыя паляўнічымі самаловы могуць знаходзіцца ў паляўнічых угоддзях у насцярожаным (узведзеным) стане на працягу ўсяго тэрміну дзеяння дазволу на здабычу паляўнічай жывёлы і пуцёўкі да яго. Пры гэтым устанаўліваць, здымаць і правяраць капканы і пасткі (у тым ліку даставаць з іх здабытых жывёл) паляўнічым можна толькі ў светлы час сутак. Таксама толькі ў светлы час дазволена паляванне з дапамогай пастак, прынцып дзеяння якіх патрабуе непасрэднай прысутнасці паляўнічага.

Калі паляўнічы выявіў ва ўстаноўленай ім прыладзе паляўнічую жывёлу нармаваных відаў, на здабычу якой у яго няма дазволу, ці жывёлу з Чырвонай кнігі, ён павінен, не дачакаючы жывёлу, праінфармаваць пра гэта карыстальніка паляўнічых угоддзяў. Пры пападанні ў капкан альбо пастку выдры ў працэсе палявання на бабра (ці наадварот) дазвол закрываецца па фактычна здабытай жывёле.

## ІНСТЫНКТ «САМАЗАХАВАННЯ» ЦІ ГЛУПСТВА?

**У момант спынення правапарушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства работнікі Дзяржаўнай інспекцыі часта сутыкаюцца з непадпарадкаваннем з боку браканьераў законным патрабаванням пры выкананні сваіх службовых паўнамоцтваў. Яно праяўляецца ў спробе парушальніка знікнуць з месца здзяйснення правапарушэння, пазбавіцца ад незаконных прылад лоўлі або палявання, незаконна здабытай прадукцыі палявання або рыбалоўства, у адмове прад'явіць дакументы або транспартныя сродкі да агляду і г.д.**

За падобныя супрацьпраўныя дзеянні прадугледжана досыць сур'ёзная адказнасць. У адпаведнасці з артыкулам 23.4 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, непадпарадкаванне законнаму распараджэнню ці патрабаванню службовай асобы дзяржаўнага органа пры выкананні ёй службовых паўнамоцтваў цягне накладанне штрафу ў памеры ад 20 да 50 базавых велічынь або адміністрацыйны арышт.

Такім чынам, парушальнікі замест аднаго пратакола непасрэдна за парушэнне прыродаахоўнага заканадаўства атрымліваюць яшчэ адзін — за аказанне непадпарадкавання. А гэта ўжо дзве штрафныя санкцыі, якія значна павялічваюць суму штрафу.

Практыка паказвае, што вялікая колькасць непадпарадкаванняў законным патрабаванням інспектараў здзяйсняецца асобамі, якія знаходзяцца ў стане алкагольнага ап'янення і ў сілу свайго фізіялагічнага стану не могуць адэкватна ацэньваць сітуацыю, якая склалася. Асобныя браканьеры, наадварот, з халодным разлікам наўмысна не выконваюць патрабаванняў з мэтай пазбегнуць адміністрацыйнай або крымінальнай адказнасці. Хутчэй за ўсё, гэта праява запозненага інстынкту самазахавання, які, у прынцыпе, у людзей павінен спрацоўваць нашмат раней, яшчэ да здзяйснення факта браканьерства.

Неабходна разумець, што работнікі Дзяржаўнай інспекцыі, якія выявілі правапарушэнне, абавязаны яго спыніць і прыцягнуць парушальнікаў да адказнасці. Аказанне непадпарадкавання ніяк не можа паўплываць на зыход справы, і, больш за тое, інспектар будзе вымушаны прымяніць падчас затрымання фізічную сілу, спецыяльныя сродкі (пярцовы газ, наручнікі) і нават табельную зброю.

У асобных выпадках парушальнікі прыродаахоўнага заканадаўства, загуляўшыся ў «супергерояў», пераступаюць нябачную мяжу паміж адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасцю. Аказваючы грубае супраціўленне, з прычыненнем шкоды здароўю работнікам Дзяржаўнай інспекцыі пры выкананні імі службовых абавязкаў, парушальнікі рызыкуюць быць прыцягнутымі да крымінальнай адказнасці.

## «ЗА КАЎНЕР» — ПАСЛЯ ПАЛЯВАННЯ

**Правілы бяспечнага абыходжання са зброяй, зацверджаныя МУС Рэспублікі Беларусь, забараняюць яе нашэнне, перавозку і выкарыстанне ў стане алкагольнага ап'янення, пад уздзеяннем наркатычных, псіхатропных, таксічных і іншых адурманьваючых рэчываў, а таксама лекавых сродкаў, якія зніжаюць увагу і хуткасць рэакцыі, у хваравітым ці стомленым стане, які ставіць пад пагрозу бяспеку людзей і захаванасць зброі.**

За парушэнне гэтай нормы артыкулам 23.48 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь прадугледжаны штраф да 10 базавых велічынь, а за тое ж дзеянне, учыненае паўторна на працягу года, памер штрафу павялічваецца да 20 базавых. Зброя пры гэтым можа быць канфіскавана, акрамя таго, паляўнічага могуць пазбавіць і спецыяльнага права. Аднак меры адміністрацыйнага ўздзеяння за такога кшталту правапарушэнні ў Беларусі даволі лаяльныя ў параўнанні, напрыклад, з краінамі Балтыі.

Так, у Эстоніі ў выпадку падобнага парушэння паляўнічаму давядзецца заплаціць штраф да 800 еўра. У Латвіі — ад 30 да 350 еўра. Паляваць са зброяй у стане алкагольнага ап'янення (наяўнасць абсалютнага этылавага спірту ў крыві ці паветры выдыху ў канцэнтрацыі больш за 0,5 праміле), і (або) стане, выкліканым ужываннем наркатычных, псіхатропных, таксічных і іншых адурманьваючых рэчываў там забаронена.

У Літве штрафы яшчэ вышэйшыя — ад 579 да 1737 еўра. Але пры гэтым прыкметай алкагольнага ап'янення лічыцца канцэнтрацыя спірту ад 1,5 праміле. Чалавеку, які знаходзіцца пад уздзеяннем наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў, паляваць забаронена. Штрафныя санкцыі прадугледжаны таксама і за адмову ад праходжання агляду на ўстаноўленым парадку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Спажывец

# СВАЕ АГУРКІ СМАЧНЕЙШЫЯ



**Спецыялісты паведамляюць, што за першае паўгоддзе адзначаецца істотнае зніжэнне імпарту бульбы ў натуральным выражэнні (на 45,7%), цыбулі (на 66,3%), капусты (на 52%), агуркоў (на 61%) і яблыкаў (на 13,8%)**

**Пра гэта паведаміла начальнік упраўлення спажывецкага рынку харчовых тавараў Міністэрства гандлю Святлана СЛІНЬКО, якая ўдакладніла, што ў Беларусі на працягу апошніх гадоў расце спажыванне свежых агародніны і садавіны.**

## БОЛЬШ ЦЫБУЛІ І МЕНШ БУЛЬБЫ

У прыватнасці, яна расказала, што калі ў 2010 годзе на ўнутраным рынку за год прадавалася каля 146 тысяч тон агародніны, то летась — каля 180 тысяч тон. Аб'ёмы рэалізацыі садавіны і ягад выраслі за пяць гадоў з 88 тысяч тон да амаль 280 тысяч тон. Пры гэтым такая дынаміка захоўваецца і сёлета. Напрыклад, толькі ў першым паўгоддзі 2016 года арганізацыі гандлю прадалі 134 тысячы тон свежай агародніны і бульбы. Станоўчая дынаміка такой рэалізацыі да ўзроўню мінулага года складае 105,2%. Таксама за гэты час было прададзена каля 140 тысяч тон свежай садавіны, што на 1,2% больш леташніх паказчыкаў. «У нас расце не толькі аб'ём спажывання такіх прадуктаў на душу насельніцтва, але змяняецца і яго структура — трохі павялічваецца доля гародніны і крыху зніжаецца попыт на бульбу», — удакладніла прадстаўніца Мінгандлю. Яна дапоўніла, што ў 2015 годзе аб'ём спажывання гародніны на душу насельніцтва склаў 145 кг, а садавіны — 79 кг, што нават вышэй за разлічаныя навукоўцамі стандарты рацыянальных нормаў.

Начальнік упраўлення звярнула ўвагу на зафіксаванае ў першым паўгоддзі павелічэнне продажаў беларускай агародніны на ўнутраным рынку на 3,4%, у тым ліку бульбы — на 3%. Спадарыня Слінько адзначыла, што тут вельмі добра спрацавалі нашы вытворцы, бо на гэтую лічбу ўплывае менавіта паступленне ў продаж ранняй маладой бульбы, якой у мінулыя гады на айчынным рынку не хапала. Існуюць у аграрыяў і пэўныя праблемы з асобнымі відамі гародніны. «Напрыклад, цяпер расце імпарт таматаў, але гэта тлумачыцца кліматычнымі ўмовамі Беларусі і складанасцю ў цэнавай канкурэнцыі айчыннай прадукцыі», — дадала Святлана Слінько.

## АД МАСКВЫ ДА МУРМАНСКА

Радуе нас і тое, што доля беларускай сельскагаспадарчай прадукцыі на сусветных рынках працягвае расці. **Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення раслінаводства — начальнік аддзела па вытворчасці плодаагародніннай прадукцыі Мінсельгасхарча Таццяна КАРБАНОВІЧ** паведамляе, што штогадовыя аб'ёмы вытворчасці дазваляюць забяспечваць патрэбы ўнутранага рынку краіны і павялічваць пастаўкі на экспарт.

У прыватнасці, сёлета на знешнія рынкі плануецца паставіць каля 300 тысяч тон бульбы, больш за 160 тысяч тон агародніны і 32 тысячы тон пладова-ягадный прадукцыі. Сёння беларуская прадукцыя запатрабавана на рынках Масквы, Санкт-Пецярбурга, Калінінграда, Мурманска і іншых буйных расійскіх гарадоў. Узрастаюць аб'ёмы экспарту беларускіх прадуктаў харчавання ў Азербайджан, Казахстан, Малдову і Украіну. У апошнія гады беларускія аграрыі павялічваюць не толькі аб'ёмы вытворчасці, але і асартымент сельгаскультур, паведаміла Таццяна Карбановіч.

## ДВА МЕСЯЦЫ СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫХ КІРМАШОЎ

Сёлета сезон рэспубліканскіх сельскагаспадарчых кірмашоў пачнецца ў Мінску з 15 верасня. Святлана Слінько ўдакладніла, што ў нашай сталіцы менавіта з 15 верасня па 15 лістапада будзе дзейнічаць 195 пляцовак для рэалізацыі плодаагароднінай прадукцыі. Яна нагадала, што з 17 верасня па 30 кастрычніка на пляцоўцы каля «Чыжоўка-Арэны» пройдуць рэспубліканскія кірмашы выхаднога дня. Таксама кірмашы сельгаспрадукцыі будуць працаваць з 1 па 2 і з 8 па 9 кастрычніка на пляцоўках каля Палаца спорту. Дадаткова выдзяляюцца пляцоўкі для рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі ў жылых мікраераёнах горада. Начальнік упраўлення паведаміла, што ў цэлым па ўсёй краіне такія кірмашы будуць праходзіць згодна з распрацаванымі міністэрствам графікамі ■

**Аб'ём спажывання гародніны на душу насельніцтва склаў 145 кг, а садавіны — 79 кг, што нават вышэй за разлічаныя навукоўцамі стандарты рацыянальных нормаў.**

■ Разумныя грошы

# ЖЫЛЛЁ Ў ЛІЗІНГ

**Цяпер камерцыйныя арганізацыі змогуць набываць у лізінг жылыя памяшканні для сваіх супрацоўнікаў**

**У прыватнасці, аб гэтым гаворыцца ў пастанове Нацбанка № 432З, дзе прапісаны змены ў правілах лізінгавай дзейнасці, а апошняе дазволіць павялічыць прысутнасць фізічных асоб на рынку лізінгу. Начальнік аддзела рэгулявання лізінгавай дзейнасці Нацбанка Аляксандр ДЗЯДКОЎ адзначыў, што гэты дакумент дазволіць больш дакладна абараняць правы лізінгаатрымальнікаў і павысіць адказнасць лізінгадацаў, каб інструмент лізінгу стаў больш эфектыўным і зразумелым менавіта для фізічных асоб.**

Ён паведаміў, што заканадаўства ў сферы абароны правоў спажыўцоў сёння распаўсюджваецца і на лізінг з фізічнымі асобамі. Напрыклад, у пастанове распрацоўшчыкі прадугледзелі, што ў выпадку скасавання дагавора лізінгу па віне лізінгадаўца, лізінгаатрымальніку вяртаюцца сумы лізінгавых плацяжоў, у тым ліку выплачанага ім авансу. Раней гэтай нормы не было.

## Дакладныя ўмовы «гульні»

Аляксандр Дзядкоў таксама адзначыў, што цяпер вызначаны парадак узгаднення бакамі цвёрдага ці прыблізнага каштарысу або калькуляцыі лізінгавых плацяжоў (у якасці яго можа выступаць адпаведны графік). Ад гэтага будзе залежаць магчымасць або немагчымасць змены гэтага графіка ў будучыні. Часта бываюць выпадкі, калі лізінгавыя плацяжы могуць мяняцца ў залежнасці ад таго, якія выдаткі нясе лізінгадавец па крэдыце, які ён узяў у банку, каб купіць прадмет лізінгу. Калі стаўка па гэтым крэдыце расце, лізінгавыя плацяжы таксама растуць. Але калі будзе ўстаноўлена, што графік з'яўляецца цвёрдым, то ён не падлягае перагляду. Калі ж графік прыблізны, то ў дагаворы павінна быць прапісана, на падставе якіх дакументаў будуць ажыццяўляцца змяненні графіка і магчымыя наступствы для лізінгаатрымальніка, калі ён не згодны з імі. Акрамя таго, паводле слоў спецыяліста, асобная ўвага ў пастанове нададзена асаблівасцям заключэння і выканання дагавораў фінансавай арэнды (лізінгу), лізінгаатрымальнікамі па якіх з'яўляюцца фізічныя асобы.

Прынятым дакументам нацыянальны рэгулятар абавязвае ўсіх лізінгадаўцаў, якія заключаюць дагаворы з фізічнымі асобамі, прадастаўляць ім на подпіс інфармацыю пра тое, якія будуць умовы канкрэтнай здзелкі. У гэтай паперы будзе прапісана ўся інфармацыя па канкрэтным прадмеце лізінгу, дзе будуць удакладняцца ўсе нюансы магчымай рызыкі, якую кліент нясе ў рамках гэтай здзелкі. «Падобнае дазволіць фізічным асобам прымаць абдуманыя і ўзважаныя рашэнні адносна эфектыўнасці і магчымых рызык заключэння прапанаваных ім дагавароў», — удакладніў пазіцыю Нацбанка Аляксандр Дзядкоў.

## Не толькі для прадпрымальніцтва

А яшчэ лізінгам цяпер дазволілі займацца сектару некамерцыйных арганізацый. «Раней такія арганізацыі не маглі набываць у лізінг маёмасць, але цяпер ім гэта права прадастаўлена. Акрамя таго, дзяржаўныя органы цяпер могуць за кошт сродкаў, якія выдзяляюцца з бюджэту, набываць маёмасць у лізінг. Напрыклад, не купляць адразу нейкі будынак, а разнесці гэтыя выдаткі па часе. У іншых краінах гэта называецца муніцыпальным лізінгам, такая магчымасць з'явілася і ў нас», — паведаміў спецыяліст.

Самай слушнай навацыяй прынятай пастановы з'яўляецца тое, што камерцыйныя арганізацыі цяпер могуць набываць маёмасць у лізінг не толькі для выкарыстання ў прадпрымальніцкай дзейнасці, але і на іншыя мэты. Напрыклад, на жыллё для сваіх супрацоўнікаў.

## Арэнда па лізінгу

Начальнік аддзела Нацбанка паведаміў, што прыняты дакумент будзе спрыяць павышэнню эфектыўнасці лізінгу ў якасці гнуткага інструмента фінансавання. Напрыклад, пастановай вызначаюцца магчымасць і ўмовы перадачы лізінгаатрымальніку атрыманай ў лізінг маёмасці ў арэнду або бязвыплатнае карыстанне трэцім асобам. Гэта дазволіць юрыдычным асобам атрымальнікам у лізінг аўтамабілі для наступнай неадназаразовай перадачы іх трэцім асобам у часовае валоданне і карыстанне па дагаворах арэнды транспартных сродкаў ■

■ Электронныя плацяжы

# І БЕЗ ПАПЕРКІ ПАВЕРАЦЬ

**Здаецца, што неўзабаве ўсе мы забудзем аб тых часах, калі абавязкова збіралі і неслі ў арганізацыі паперкі аб аплаце любых плацяжоў. Цяпер плацельшчык ужо не абавязаны прад'яўляць папяровы чэк для пацвярджэння плацяжу, ажыццёўленага пры дапамозе аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы (АІС «Разлік»), паведамляе прэс-служба Нацыянальнага банка.**

Менавіта ў сувязі са шматлікімі пытаннямі, якія паступалі ад грамадзян адносна спосабаў пацвярджэння факта здзяйснення імі розных відаў плацяжоў, Нацбанк падрыхтаваў адпаведны каментарый.

## Безнаяўнымі нават лепш

Тут, у прыватнасці, гаворыцца, што цяпер плацяжы, звязаныя з дзяржаўнай пошлінай, пры ажыццяўленні адміністрацыйных працэдур, аплаце падаткаў, збораў (пошлін), тавараў (работ, паслуг), на карысць дзяржаўных органаў і арганізацый, фізічных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў могуць ажыццяўляцца рознымі шляхамі.

Такую аплату можна рабіць па лініі падачы ў банк папяровых квітанцый, праз сістэму дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання, шляхам выкарыстання электронных грошай, з выкарыстаннем банкаўскіх плацежных картак у структуры «Белпошта», а таксама праз сістэму АІС «Разлік» безнаяўным чынам.

Факт аплаты плацяжу ў бюджэт праз АІС «Разлік» пацвярджаецца наяўнасцю ў гэтай сістэме інфармацыі пра такія плацяжы. У якасці нумара дакумента, які пацвярджае факт ажыццяўлення плацяжу ў бюджэт праз АІС «Разлік», выкарыстоўваецца ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы. Інфармацыя пра нумар аперацыі ў сістэме «Разлік» даступная плацельшчыку ў дакуменце, які пацвярджае здзяйсненне плацяжу (квітанцыя, чэк, карт-чэк).

Пры гэтым вытворцы паслуг атрымліваюць з АІС «Разлік» электронныя рэестры аплачаных плацяжоў, якія пацвярджаюць ажыццяўленне плацяжу плацельшчыкам. Праўда, у асобных выпадках юрасобы маюць права патрабаваць ад плацельшчыка яшчэ і папяровыя дакументы аб ажыццяўленні плацяжоў. Менавіта каб удакладніць гэты нюанс пра асобныя выпадкі, Нацбанк паведамляе наступнае.

## Заканадаўства не патрабуе

Дзейнае бюджэтнае і падатковае заканадаўства не змяшчае нормаў, якія абавязваюць плацельшчыка пацвярджаць факт аплаты дзяржаўнай пошліны, плацяжоў пры ажыццяўленні адміністрацыйных працэдур, падаткаў, збораў (пошлін) і іншых грашовых пералічэнняў у бюджэт на папяровым носьбіце ў выпадку, калі плацеж адбыўся ў АІС «Разлік».

Па ўсіх відах названых вышэй плацяжоў, якія ажыццяўляліся не ў АІС «Разлік», вытворца паслуг мае права, а пры аплаце дзяржаўнай пошліны абавязаны запатрабаваць ад плацельшчыка прадастаўленне чэка (квітанцыі) на папяровым носьбіце.

А яшчэ спецыялісты нацыянальнага фінансавага рэгулятара паведамляюць, што Падатковы і Бюджэтны кодэксы Беларусі маюць вышэйшую юрыдычную сілу ў дачыненні да актаў міністэрстваў і ведамстваў. «Таму патрабаванні вытворцаў паслуг, падключаных да АІС «Разлік», аб прад'яўленні плацельшчыкамі чэка (квітанцыі) на папяровым носьбіце ў якасці пацвярджэння факта здзяйснення плацяжу, які ажыццяўляецца ў гэтай сістэме, з'яўляюцца неправамернымі», — удакладняе сваю пазіцыю Нацбанк.

Усё. Цяпер тым, хто аплачвае розныя паслугі, зборы і падаткі праз сістэму «Разлік» (безнаяўнымі грашыма), ужо не трэба несці адпаведную паперку ў кожную інстанцыю ці да вытворцы. А чэк (калі ён ёсць) можна захаваць для ўласных мэт. Напрыклад, каб не забыцца і не заплаціць за нешта двойчы...

*ДАРЭЧЫ*

### Карыстанне АРІП стала таннейшым на 0,2%

Старшыня праўлення акцыянернага таварыства «Нябанкаўская крэдытна-фінансавая арганізацыя «Адзіная разліковая і інфармацыйная прастора « (АРІП) Алег Верамейчык паведаміў, што імі прынята рашэнне аб тым, што камісія за аплату жыллёва-камунальных паслуг праз сістэму АІС «Разлік-ЖКП «з 1 верасня складзе 1%, пры тым што сярэднеўзважаная камісія па галіне была 1,2%.

Паводле яго слоў, перадумовы для зніжэння ўзроўню банкаўскага ўзнагароджання стварае перавод плацяжоў у дыстанцыйныя каналы. Так, цяпер доля безнаяўных разлікаў за ЖКП у АРІП перавышае 50% — як па колькасці, так і па суме. А ў апошнія часы найбольш актыўна насельніцтва выкарыстоўвае дыстанцыйныя каналы банкаўскага абслугоўвання. Адзіная разліковая і інфармацыйная прастора функцыянуе ў Беларусі з 2008 года. У межах АРІП плацяжы прымаюцца на карысць больш за 12,7 тысячы арганізацый, ажыццяўляецца больш за 56 тысяч відаў плацяжоў ва ўсіх банках краіны. «Менавіта ў верасні на завяршальнай стадыі знаходзіцца працэс уключэння ў праект АРІП РУП «Белпошта», — сказаў Алег Верамейчык.

Матэрыялы старонкі падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ. kurkach@zviazda.by

■ Працяг тэмы

## У РОДНЫХ СЦЕНАХ З ЛЮБІМЫМІ ЛЮДЗЬМІ

### Пенсіянерку, якую органы апекі хацелі адправіць у інтэрнат, прызналі дзеяздольнай

**Амаль паўгода таму «Звязда» пісала пра гісторыю 93-гадовай Клаўдзіі Бараўковай (нумар за 15 красавіка 2016-га). Адзінокую пенсіянерку хацелі прызнаць недзеяздольнай і перасяліць з мінскай аднапакаёўкі ў псіханеўралагічны інтэрнат. Органы апекі запэўнівалі: жанчына не можа самастойна клапаціцца пра сябе і не ўсведамляе сваіх дзеянняў. Галоўным аргументам на карысць гэтага чамусьці быў непарадак у кватэры, які сама Клаўдзія Нікандраўна тлумачыла вельмі проста: ёй так зручна. Суд Савецкага раёна сталіцы тады прызначыў незалежную амбулаторна-камісійную судова-псіхіятрычную экспертызу, якая павінна была паставіць кропку ў гэтай спрэчнай сітуацыі. Нарэшце стала вядома, чым скончылася тая справа.**

Суд правёў уласную экспертызу. На працягу некалькіх гадзін пенсіянерку апытвалі спецыялісты і далі сваё заключэнне. Незалежныя эксперты пацвердзілі, што ў Клаўдзіі Нікандраўны назіраецца сасудзістая дэменцыя (пагаршэнне інтэлектуальных здольнасцяў чалавека, выклікане праблемамі з кровазваротам у галаўным мозгу). Але парушэнні мінімальныя і гэты дыягназ не з'яўляецца пакаваннем для таго, каб прызнаць жанчыну недзеяздольнай. Па сваім псіхічным стане на гэты момант ветэран можа разумець значэнне сваіх дзеянняў і кіраваць імі.

Сама Клаўдзія Нікандраўна рада, што гэта гісторыя нарэшце скончылася. Але прызнаецца: крыўда засталася. Калі прыходзім праведаць пенсіянерку, яна чарговы раз праводзіць нам экскурсію па сваёй кватэры, каб запэўніць, што ніякага смецця і непрыемнага паху ў жыллі няма.

— А гарнітуры я раскладаць ужо не буду, — старая акідвае позіркам каробкі. — Прыстасавалася. Мне камфортна.

На пытанне пра здароўе Клаўдзія Нікандраўна адказвае шчыра: залежыць ад надвор'я.

— Кожны дзень па-рознаму. Сёння лягчэй, нават падмесці змагла. Але час жа ідзе, не маладзею.

Два разы на тыдзень (у аўторак і пятніцу) да жанчыны прыходзіць сацыяльная работніца. Дапамагае выносіць смецце, аплачвае жыроўку. «У мяне да яе прэтэнзій няма, — кажа Клаўдзія Нікандраўна. — Калі прашу што-небудзь яшчэ, яна робіць. Нядаўна купляла мне, напрыклад, адзенне і пральны парашок. У нас з ёй добрыя адносіны».

Па-ранейшаму пенсіянерку наведваюць былы сусед Аляксей з жонкай і сястра Тацццяна са Свята-Елісавецінскага манастыра.

— Я сясцёр міласэрнасці называю сучаснымі цімураўцамі, — усміхаецца ветэран. — Яны віншуюць мяне з рэлігійнымі святамі. Нават з гасцінцамі прыходзяць.

І хоць родных у Клаўдзіі Нікандраўны не засталося, яна ўпэўнена, што з асяроддзем ёй пашанцавала: «Навошта мне ісці ў інтэрнат, калі ў мяне ёсць любімыя людзі?»

Чаму 34-я паліклініка, якая выконвае функцыі органа апекі, так настойліва патрабавала перасялення старой у псіханеўралагічны інтэрнат, адказаць складана. Магчыма, хтосьці меў планы на кватэру жанчыны (яе гаспадыня толькі нядаўна прыватызавала і ўжо завяшчала маладому хлопцу Аляксею, які некалькі гадоў даглядае бабулю). Але хутчэй за ўсё пытанне стала простая фармальнасць. У Клаўдзіі Нікандраўны складаны характар, і трэба праявіць цярпенне і разуменне, каб паладзіць з ёй. Куды прасцей афарміць пенсіянерку ў спецыяльную ўстанову, чым самім несці адказнасць за жыццё старога чалавека і магчымыя нязручнасці, якая яна можа даставіць іншым жыхарам дома.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■

# «ЗАРАЗ ГЭТАЕ ПЫТАННЕ НЕ РАЗГЛЯДАЕЦЦА»

## Міністэрства працы і сацыяльнай абароны аб далейшым павышэнні пенсійнага ўзросту

**Як вядома, з 1 студзеня 2017 года ў Беларусі пачне паэтапна павышацца пенсійны ўзрост да 58 гадоў для жанчын і 63 — для мужчын. Многіх беларусаў цікавіць, ці будзе ён падымацца і далей. На гэтае і іншыя пытанні, звязаныя з пенсійным забеспячэннем, адказалі прадстаўнікі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны на анлайн-канферэнцыі, якая прайшла на сайце ведамства.**



Людзі ва ўзросце — носьбіты каштоўнага жыццёвага досведу.

### Дадатковыя пенсійныя накапленні — на добраахвотнай аснове

***Праз нізкі пенсійны ўзрост Беларусь з'яўляецца першай у Еўропе па колькасці пенсіянераў. Магчыма, тэмп павышэння пенсійнага ўзросту занадта павольны? Можа, потым прыйдзецца зноў яго падымаць?***

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ:**

— Прадугледжаны тэмп павышэння пенсійнага ўзросту — штогод на 6 месяцаў — прымяняўся і прымяняецца ў многіх краінах. У нас ён выбраны з улікам асаблівасцяў узроставай структуры насельніцтва, а таксама ёмістасці рынку працы, каб «перадпенсійныя» кагорты мелі магчымасць працягваць працоўную дзейнасць да дасягнення «новага» пенсійнага ўзросту.

Што тычыцца далейшага павышэння пенсійнага ўзросту — час пакажа, але сёння гэтае пытанне не разглядаецца. Тут важна, як будуць складвацца дэмаграфічныя працэсы, якой будзе сітуацыя з паступленнем унёскаў у бюджэт Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Значэнне будуць мець і іншыя фактары — занятасць, міграцыя...

***Ці плануецца змяняць (пашыраць) узроставыя рамкі для надбаўкі да пенсіі за даўгалецце? Напрыклад, увесці такую надбаўку 70-гадовым? Калі будуць павялічвацца тыя надбаўкі, якія ўжо маюцца?***

**Валерый Кавалькоў:**

— З 2012 года да пенсій непрацуючых атрымальнікаў, якія пастаянна пражываюць у Беларусі, стаяць на ўліку ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, старэйшых за 75 гадоў, устаноўлены штомесячныя даплаты. Для асоб, якія дасягнулі 75 гадоў, памер даплаты складае 75% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце. Па дасягненні 80 гадоў памер гэтай даплаты павялічваецца да 100% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце.

У існуючай дэмаграфічнай сітуацыі, калі пенсійная нагрузка на эканаміччна актыўнае насельніцтва расце, пашыраць кола атрымальнікаў узроставых даплат да пенсій не плануецца. Што датычыцца павелічэння памераў даплат, то яны пераразлічваюцца ў сувязі з ростам бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва. Сёлета яны павышаліся ў лютым, красавіку (з даплатай за сакавік), маі і жніўні. Са жніўня памеры даплат складаюць 33 руб. для асоб ва ўзросце 75-79 гадоў і 44 руб. для асоб ва ўзросце 80 гадоў і старэйшых.

***Ці будзе ў сувязі з павышэннем пенсійнага ўзросту павялічвацца патрабаваны стаж?***

**Начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Наталля МУРАШКЕВІЧ:**

— Патрабаваны стаж працы з выплатай абавязковых страхавых унёскаў ужо павялічваецца з 1 студзеня 2016 года штогод на 6 месяцаў да дасягнення ў 2025 годзе 20 гадоў. У бягучым годзе ён складае 15 гадоў 6 месяцаў. Іншыя патрабаванні па стажы (агульны стаж, спецыяльны стаж) застануцца ранейшымі.

***Сярэдняя працягласць жыцця сельскіх мужчын значна ніжэйшая, чым гараджан. Чаму гэта не ўлічана пры павышэнні пенсійнага ўзросту?***

**Валерый Кавалькоў:**

— Гэты фактар улічаны. У тым ліку і з гэтай прычыны быў адхілены варыянт павышэння пенсійнага ўзросту мужчынам да 65 гадоў, нягледзячы на яго значны эканамічны эфект.

***Ва ўказе — штогод павелічэнне пенсійнага ўзросту на 6 месяцаў, чаму другая палова 1962 года ідзе праз год? Дзе павелічэнне штогод на 6 месяцаў, як сказаў Прэзідэнт?***

**Валерый Кавалькоў:**

— Павышэнне пенсійнага ўзросту ў адпаведнасці з Указам №137 прывязана не да даты нараджэння, а да каляндарнага года. За 6 гадоў пенсійны ўзрост будзе падвышаны ўсяго на 3 гады, г.зн. па 6 месяцаў штогод.

***Ходзяць чуткі, што з 1 верасня гэтага года пенсіянерам, якія працуюць, будуць вылічваць з пенсіі 40%, ці праўда гэта?***

**Наталля Мурашкевіч:**

— Якіх-небудзь змен у парадку выплаты пенсій пенсіянерам, якія працуюць, цяпер не плануецца.

***Раней шмат гаварылася аб накапляльнай пенсійнай сістэме. Многія краіны ўвялі гэты элемент. Якія вынікі? І што тычыцца Беларусі — у якой перспектыве разглядаецца магчымасць увядзення накапляльнай элемента ў пенсійную сістэму?***

**Валерый Кавалькоў:**

— Многія дзяржавы, дзе было ўведзена агульнаабавязковае накапленне, былі вымушаны адмовіцца ад яго альбо знізіць аб'ём накапляльнага кампанента з прычыны адмоўнага ўплыву на стабільнасць дзяржаўнай пенсійнай сістэмы — з'явіўся дэфіцыт фінансавых сродкаў. Такія рашэнні прынятыя ў Венгрыі, Польшчы, Славакіі, Харватыі, Балгарыі, Аргенціне, Літве, Латвіі, Румыніі, Расіі. З улікам негатыўнага вопыту гэтых краін у Беларусі дадатковыя пенсійныя накапленні плануецца развіваць на добраахвотнай аснове. Страхавыя арганізацыі прапануюць добраахвотныя праграмы страхавання дадатковай пенсіі. Таксама зберажэнні на старасць можна фарміраваць у банку.

### Пенсійны ўзрост вызначаецца на дату звароту па пенсію

***Ці змогуць датэрмінова пайсці на пенсію беспрацоўныя?***

**Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Ларыса ЯШКОВА:**

— Такая магчымасць прадугледжана Законам «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь». Беспрацоўным, якія маюць права на дапамогу па беспрацоўі на працягу 52 каляндарных тыдняў, па прапанове службы занятасці пры адсутнасці магчымасці для працаўладкавання можа быць прызначана датэрміновая пенсія, але не больш чым за 1 год да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту.

***Ці будзе захаваны пенсійны ўзрост для тых, хто працуе ў шкодных умовах?***

**Наталля Мурашкевіч:**

— Узрост для льготнай пенсіі будзе паступова павялічвацца гэтак жа, як і агульны пенсійны ўзрост — на 3 гады, па 6 месяцаў за год. Тым самым 10-гадовая або 5-гадовая розніца ва ўзросце для льготнай пенсіі і агульнай пенсіі захаваецца. Не зменіцца таксама і неабходны льготны стаж для прызначэння гэтай пенсіі.

***Ці зменіцца ўзрост, з моманту наступлення якога наймальнік не мае права звольніць супрацоўніка перадпенсійнага ўзросту?***

**Валерый Кавалькоў:**

— У сувязі з прыняццем Указа №137 і павелічэннем агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту будуць перагледжаны нарматыўныя прававыя акты, якія закранаюць розныя сферы праваадносін з асобамі пенсійнага і перадпенсійнага ўзросту.

***Ці прывядзе павышэнне ўзроставага парога да павелічэння памеру працоўных пенсій?***

**Наталля Мурашкевіч:**

— Замацаваны Указам адносна «мяккі» варыянт павышэння пенсійнага ўзросту і плаўныя тэмпы яго ўвядзення арыентаваны на захаванне, гэта значыць незніжэнне наяўнага ўзроўню пенсій.

***Чуў, што ў пенсію не залічваецца перыяд ваеннай службы. Хіба гэта справядліва?***

**Ларыса Яшкова:**

— Перыяды ваеннай службы ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь і ва Узброеных Сілах былога СССР (за выключэннем ваеннай службы на тэрыторыі Латвіі) як уключаліся, так і ўключаюцца ў стаж працы і аказваюць уплыў на памер пенсіі. Гэта рэгламентуецца Законам «Аб пенсійным забеспячэнні».

Аднак для прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце неабходна мець у 2016 годзе не менш як 15 гадоў 6 месяцаў працы з выплатай абавязковых страхавых узносаў. Гэты страхавы стаж штогод з 1 студзеня будзе павялічвацца на 6 месяцаў да дасягнення 20 гадоў. Для бацькоў дзяцей-інвалідаў, шматдзетных маці, інвалідаў з дзяцінства і іншых сацыяльна неабароненых катэгорый, для якіх фарміраванне доўгага страхавога стажу аб'ектыўна цяжкае, патрабуецца 5 гадоў страхавога стажу. Перыяды дзейнасці без выплаты абавязковых страхавых узносаў у страхавы стаж не ўключаюцца.

***15 снежня гэтага года мне спаўняецца 55 гадоў. Кантракт у мяне заканчваецца ў сакавіку 2017 года, і я планавала звярнуцца па пенсію на чатыры месяцы пазней, каб дарабіць да поўнага года. Аднак у сувязі з прыняццем указа аб павышэнні пенсійнага ўзросту ў мяне ўзнікла пытанне: мне ў сакавіку 2017-га прызначаць пенсію?***

**Ларыса Яшкова:**

— Калі вы не звернецеся па пенсію да 31 снежня 2016 года, то ў 2017 годзе права на пенсію ў вас узнікне толькі па дасягненні ўзросту 55 гадоў 6 месяцаў, гэта значыць 15 чэрвеня. Таму вы можаце звярнуцца па пенсію ў снежні 2016 года, прызначыць яе і атрымліваць альбо адмовіцца ад яе на любы тэрмін і сфарміраваць дадатковыя пенсійныя правы — больш працяглы стаж і яшчэ прэмію за працу без атрымання пенсіі.

***Чаму ўзрост выхаду на пенсію будзе залежаць не толькі ад даты нараджэння, але і ад даты звароту па прызначэнне пенсіі? І як дзейнічаць, каб праз уласную або чыюсьці (напрыклад, аддзела кадраў) віну не выйсці на пенсію пазней на паўгода?***

**Ларыса Яшкова:**

— У адпаведнасці з палажэннямі Указа №137 кожны год вызначаецца новы пенсійны ўзрост. Гэта значыць, што пенсійны ўзрост вызначаецца на дату звароту па пенсію. Так, пры звароце па прызначэнне пенсіі ў 2017 годзе пенсійны ўзрост для мужчын складае 60 гадоў 6 месяцаў, для жанчын — 55 гадоў 6 месяцаў, у 2018-м — 61 год і 56 гадоў адпаведна і г.д. Заканадаўствам прадугледжваецца магчымасць падачы дакументаў за месяц да дасягнення пэўнага ўзросту.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

# ЭСТАФЕТУ Ў РАГАЧОВА ПРЫМАЕ ПОЛАЦК

## Імя Караткевіча як талісман

Да Дня беларускага пісьменства выдавецтва «Мастацкая літаратура» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі падрыхтавала кнігу «Добры дух зямлі дняпроўскай: Рагачоўшчына літаратурная». У ёй сабраны творы паэтаў і празаікаў — выхадцаў з гэтай зямлі. Дарэчы, штогод у Беларусі выдаецца звыш 11 тысяч



найменняў кніг. У крамы і бібліятэкі краіны паступае каля 33 мільёнаў асобнікаў. Папоўніліся ў дзень свята падарункамі ад высокіх гасцей і фонды Рагачоўскай раённай бібліятэкі. У гэты дзень тут адкрыты Дом кнігі, якому нададзена імя Уладзіміра Караткевіча. Пад дахам размясціліся кнігарня «Першацвет» і непасрэдна бібліятэкі — дарослая і дзіцячая, якія раней былі ў розных будынках. **Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ** перадаў у падарунак кнігі ад творчай арганізацыі і падзякаваў усім, хто дапамог стварыць утульны будынак:

— Чалавек, які перастае чытаць, перастае думаць. Таму сённяшняя падзея ўвасабляе жаданне жыхароў Рагачова і раёна развіваць і ўдасканальваць веды.

Менавіта ў Рагачове распачата новая добрая традыцыя. Вядомыя дзеячы беларускай культуры, спорту, службовыя асобы расказваюць пра свае любімыя выданні і перадаюць іх у падарунак Дому кнігі. Напрыклад, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі краіны Раман Матульскі параіў усім прачытаць «Пінскую шляхту» Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Уладзіміра Караткевіча назвалі тут «каралём вострасюжэтнай прозы». Яго твор «Дзікае паляванне караля Стаха» парэкамендаваў спявак Аляксандр Ціхановіч.

**Дырэктар Рагачоўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі Таццяна ГОЛУБЕВА** заўважае, што зроблена ўсё, каб напаўненне будынка адпавядала яго знешняму выгляду. Асабліва тут паклапаціліся пра дзяцей, якім адведзена значная частка памяшканняў:

— У нас ёсць дрэва творчасці. Мы часта абвяшчаем конкурсы малюнкаў. На гэтым дрэве іх развешваем. Таксама ў нас ёсць незвычайны растамер. На ім вымяраем не толькі рост дзіцяці, але і тое, да якой кнігі ў якім узросце яно дарасло.

## «Газетны бульвар» і XX стагоддзе

Увесь горад на час правядзення Дня беларускага пісьменства ператвараецца ў адно вялікае свята. На «Газетным бульвары» размясцілася перыёдыка Гомельшчыны. Тут былі прадстаўлены ўсе мясцовыя выданні. Стэнд кожнага з іх ілюстраваў пэўны гістарычны перыяд мінулага стагоддзя — тое, як развівалася перыёдыка. Пішучай машынкай, тут, лічы, нікога было не здзівіць, — яны стаялі ледзь не на кожным стэндзе. Можна было дакрануцца да клавішаў і прыгадаць, як нараджаліся газеты ў тыя часы, калі яшчэ не было інтэрнэту.

Газета «Добрушскія навіны» прадстаўляла 1960-я гады. Стары прайгравальнік, модныя ў той час пласцінкі... Знайшлі і развесілі і шматлікія плакаты, што калісьці нароўні з газетамі былі закліканыя агітаваць, накіроўваць ход думак чытачоў.



Што паглядзець і чым пазабавіцца было і на стэндзе Выдавецкага дома «Звязда». Экалагічны майстар-клас ад часопіса «Родная прырода», выраб паштоўкі сваімі рукамі дзякуючы ўмельцам з часопіса «Алеся», аўтограф-сесіі пісьменнікаў Алеся Марціновіча і Уладзіміра Мазго, шарж у падарунак падпісчыкам часопіса «Вожык» — вось толькі невялікая частка цікавінак, якімі тут радавалі гасцей. На стэндзе, дарэчы, было вельмі людна. Нашы шаноўныя чытачы завіталі сюды, проста каб дакрануцца да таго свету, у якім ствараюцца іх любімыя газеты і часопісы.

## Нацыянальная, літаратурная

Сёлета ўжо ў другі раз уручалася Нацыянальная літаратурная прэмія. Такая традыцыя ўзнагароджвання, закліканая падтрымліваць айчынных аўтараў, была закладзена летась у Шчучыне. На гэты раз ва ўсіх сямі намінацыях былі вызначаны пераможцы.

Ганаровы дыплом, статуэтку і грашовую прэмію намінацыі «Найлепшы твор прозы» атрымаў **Алесь МАРЦІНОВІЧ** за зборнік гістарычных апавяданняў «Цяпло ранейшых вогнішчаў». Карэспандэнту нашага выдання ён адзначыў:

— У маю кнігу, якая сёння перамагла, увайшлі гістарычна-мастацкія апавяданні і эсэ. У іх распавядаецца пра многіх славутых асоб, пачынаючы ад сівой даўніны і да нашага часу. Гэта, напрыклад, унучкі Рагнеды, адна з якіх была французскай каралевай, другая — венгерскай, а трэцяя — нарвежскай... Я даўно пішу на гістарычную тэму, ужо даследаваў лёсы 300 гістарычных дзеячаў.

У намінацыі **«Найлепшы твор паэзіі»** ўладальнікам прэміі стаў **Мар'ян ДУКСА** за кнігу «Птушка вечнасці — Душа».

— Любая ўзнагарода — гэта гонар. Аднак яна прымушае яшчэ больш творча працаваць. Прыемна, што журы ацаніла мае філасофскія і рэлігійныя ідэі, — адзначыў паэт. — А што да стварэння вершаў, то часцей за ўсё найперш прыходзіць думка, якая выклікае натхненне. Мае творы больш сэнсавыя, ідэйныя. Пэўны пасыл, які я хачу данесці да чытача, даводзіцца расквечваць мастацкімі фарбамі.

У намінацыі **«Найлепшы твор публіцыстыкі»** прэмія прысуджана пісьменніку-гісторыку **Мікалаю БАРЫСЕНКУ** за кнігу «Рэха Вялікай вайны ва Усходняй Беларусі (1914—1918)». Ён адзначыў, што працуе на мяжы гісторыі, літаратуры, краязнаўства і пошуку і аховы помнікаў самага ўсходняга рэгіёна Беларусі.

У намінацыі **«Найлепшы твор для дзяцей і юнацтва»** лаўрэатам стаў **Сяргей ДАВІДОВІЧ** за кнігі «Дзедава жалейка», «Баявая нічыя», «Залаты буліт».

— Я пішу не толькі для дзяцей... Жыццё такое шматграннае, цікавае, што пісаць на адну тэму было б сумна, — адзначае аўтар. — Аднак кожнаму пісьменніку, на маю думку, трэба звяртацца да дзіцячай тэмы. Адзін з маіх герояў кажа, што можна праводзіць своеасаблівы тэст на чалавека з жывой душой: калі ён чытае казкі, значыць, усё ў парадку, а калі не — значыць, галасы маленства ў ім памерлі... Хоць у мяне было цяжкое дзяцінства — ваеннае і паваеннае, памятаю нават голад, — той час усё адно ўспамінаецца мне цудоўным і чароўным, я з ім не растаюся ніколі.

У намінацыі **«Найлепшы драматычны твор»** перамог **Ягор КОНЕЎ** з п'есай «Злачынства і пакаранне на берагах Свіслачы», якая летась была апублікавана ў часопісе «Маладосць». Гэты аўтар у свой час друкаваўся ў «Чырвонай змене», а цяпер актыўна супрацоўнічае са «Звяздой» і «Літаратурай і мастацтвам». Ён крыху расказаў пра свой твор і падзяліўся думкамі адносна сучаснай драматургіі:




— П'еса прысвечана вядомаму беларускаму сышчыку і следчаму Андрэю Станкевічу, які расследаваў злачынствы, зробленыя Марынай Дастаеўскай у 1605 годзе. Тады адбывалася цэлая эпапея, якая завяршылася толькі ў 1609 годзе. Марыю пакаралі за ўчыненае забойства, але да гэтага яна паспела нарадзіць дзіця і прадоўжыць род, у якім праз некалькі пакаленняў з'явіўся славуты аўтар «Злачынства і пакарання» Фёдар Дастаеўскі... Хачу адзначыць, што ў беларускай нацыянальнай драматургіі глыбокія гістарычныя карані і шмат цікавых сучасных аўтараў. Але яны, на жаль, вельмі небагата прадстаўлены ў рэпертуары нашых тэатраў. Мне здаецца, вырашыць гэту праблему можна сумеснымі намаганнямі драматургаў, якія мусяць і надалей шчыраваць на ніве беларускага пісьменства, і намаганнямі кіраўніцтва тэатраў, якім трэба зразумець, што мы цікавыя свету найперш беларушчынай... А таксама дзякуючы падтрымцы дзяржавы, якая спрыяе тэатру і заахвочвае аўтараў, у тым ліку такой прэміяй, якую я маю гонар атрымаць.

Навуковае выданне «Беларускі імпрэсіянізм» **Таццяны МАЦЮХІНАЙ** атрымала перамогу ў намінацыі **«Найлепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства»**. У намінацыі **«Найлепшы дэбют»** уладальнікам прэміі стаў **Сяргей КЛІМКОВІЧ** за кнігу для дзяцей «Таямніца кватэры №8» у чатырох тамах. Варта адзначыць, што ў гэтага аўтара ўжо шмат уласных кніг. А вось у дзіцячай тэматыцы ён паспрабаваў сябе ўпершыню.

Пераможцаў яшчэ аднаго конкурсу таксама ўшаноўвалі ў Рагачове. Ужо чацвёрты год запар, каб папулярызаваць культурна-гістарычныя і духоўныя каштоўнасці нашага народа, праводзіцца конкурс «Залатое пяро «Белай Русі». У ім прымаюць удзел маладыя журналісты, школьнікі і студэнты, а таксама журналісты рэгіянальных і рэспубліканскіх СМІ. Найлепшых выбралі і ўганаравалі на галоўнай сцэне Рагачова. Пераможцы атрымалі свае ўзнагароды. А падарункам таксама і для гараджан стаў канцэрт акардэаніста сусветнага ўзроўню Ігара Квашэвіча і спевака Аляксея Хлястова.

## І з блізкага замежжа, і з далёкага

Сярод удзельнікаў сёлетняга Дня беларускага пісьменства ў Рагачове — прадстаўнікі акрэдытаваных у краіне пасольстваў і ўпершыню — амаль дваццаці беларускіх дыяспар з блізкага і далёкага замежжа. **Кіраўнік асацыяцыі беларусаў у Францыі Святлана СУРАВА** кажа, што свята вельмі спадабалася і надзвычай прыемна было пачуць родную мову. Дарэчы, на новым месцы жыхарства таксама яе не забываюць:

— Мы адзначаем беларускія народныя святы. Спявалі гімн Беларусі каля Эйфелевай вежы падчас акцыі, арганізаванай нашай асацыяцыяй і Пасольствам Рэспублікі Беларусь.

Роднае слова літаральна ажыло на вуліцах Рагачова. Прэзентацыі новых зборнікаў і аўтограф-сесіі літаратараў збіралі аўдыторыі, а на імправізаваны друкарскі двор XVI стагоддзя выстройваліся чэргі. З дапамогай беларускага калекцыянера і гісторыка Уладзіміра Ліхадзедава кожны жадаючы мог адчуць сябе першадрукаром і зрабіць паперу з лёну, а потым надрукаваць на ёй тэкст так, як гэта рабілі пяць стагоддзяў таму. Усе станкі з'яўляюцца дзейнымі экспанатамі першага беларускага музея пісьменства, які цяпер ствараецца ў Вілейцы.

...У новую гісторыю Рагачова Дзень беларускага пісьменства ўжо ўвайшоў. Эстафету прымае Полацк, які ў 1994 годзе ўжо быў гаспадаром свята, тады ўпершыню заснаванага. Дарэчы, налета адзначым і 500-годдзе айчыннага кнігадрукавання. Менавіта ў 1517 годзе Францыск Скарына надрукаваў Псалтыр, а за ім і іншыя кнігі Бібліі.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*
**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*astashkevich@zviazda.by*
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і Сяргея НІКАНОВІЧА.**
*Рагачоўскі раён.*



**Пасадкай сада Малітвы ў Рагачове завяршылася духоўна-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў»**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Рэпартаж з нагоды

# ЗАХАПЛЯЛЬНАЕ ПАДАРОЖЖА,

## або Чым на Дзень горада здзіўляла сталіца

**Не сакрэт, што ў асноўнай масы гараджан у штодзённай мітусні часам сціраецца адчуванне ўнікальнасці іх месца жыхарства. Мы прагуляліся па святочнай сталіцы ў Дзень горада і паспрабавалі зноўку з ёй пазнаёміцца.**

Прымяраю на сябе вобраз турысткі, якая ўпершыню апынулася ў сталіцы Сінявокай. Забягаючы наперад, хачу адзначыць, што, як аказалася, такое «амплуа» выбрана было недарма. Замежнікаў у гэты дзень у горадзе сапраўды шмат. Каюся, але я, калі ўдавалася, імкнулася падслухаць іх размовы на англійскай. У адным выпадку гасцінны гаспадар-беларус спрабаваў растлумачыць сям'і, відаць па ўсім, нямецкай, якая дружна аплятала тонкія блінцы, што такое верашчака. У другім выпадку маладзенькая дзяўчына распавядала сваім сябрам з Кітая аб значэнні манумента Перамогі. Такіх змяшаных беларуска-замежных дэлегацый на маім шляху сустрэлася каля дзесяці. Ну што ж, адчуем сябе іх часткай.

Пачынаю падарожжа з Кастрычніцкай плошчы. Калі ў метро ў абед людзей нават больш, чым у будны дзень і ў час пік, то ў самім цэнтры чамусьці амаль пуста. Гэта здзіўляе мяне і ў ролі мінчанкі, і ў ролі іншаземкі — хіба свята пачынаецца не тут? Я яшчэ памятаю, як на Кастрычніцкай плошчы падчас свят праводзілі кірмашы і ладзілі вялікія канцэрты. Цяпер жа пра Дзень горада нагадваюць толькі шматлікія сцягі, якія развіваюцца на ветры. Складана не заўважыць мноства стэндаў і рэкламных банераў, якія апавяшчаюць аб парламенцкіх выбарах. Відаць, прыезджы не зможа не адзначыць, наколькі гэта значная падзея для дзяржавы.

Пастаяўшы на амаль бязлюднай плошчы, адпраўляюся далей. Мінуем «Цэнтральны» — самую мінскую з усіх існых крам, сёння ўніверсам не ў прыярытэце, бо пасля рамонту адкрылі не менш знакавую «Лакомку». Не так даўно крама ласункаў стала сапраўдным яблыкам разладу: неабыякавыя мясцовыя жыхары, многія з якіх памятаюць яе яшчэ з далёкага дзяцінства, былі катэгарычна супраць пераробілівання. Пагаворвалі, што крама проста знікне, а на яе месцы з'явіцца чарговы фастфуд. Аднак самыя страшныя асцярогі не спраўдзіліся: месца выкупіла мінская кандытарская фабрыка «Камунарка» і паабяцала захаваць непаўторны каларыт. І многія жыхары сталіцы з нецярпеннем чакалі Дня горада, каб ацаніць перамены.

Акрамя гандлёвых пляцовак, у прасторнай зале з'явіўся кафетэрый: 3 двухмесныя і 3 вялікія столікі. У дзень адкрыцця да іх, відаць, было не падступіцца. Інтэр'ер стаў больш вытанчаным: масіўныя люстры і драўляныя панэлі. Замест «саўка» — савецкі шык. На сцяне велізарная рэпрадукцыя карціны Івана Хруцкага «Партрэт жонкі з кветкамі і садавінай». Гандлёвая зала падзелена на секцыі: па цукеркі, алкаголь і торцік давядзецца пастаяць у розных чэргах. Увесь асартымент, на шчасце, захаваны — пераарыентацыі выключна на прадукцыю фабрыкі «Камунарка», як гэтага асцерагаліся, не адбылося. Засталася нязменнай і «смачная» назва. Уключаю «рэжым замежніцы». На прылаўку — дэсерты, якія не знойдзеш нідзе, акрамя як на постсавецкай прасторы (чаго варты адзін кошык з бялковым крэмам!), — і ўсё гэта па смешных цэнах. Чаго не скажаш пра шакаладныя цукеркі, выстаўленыя на першы план, — гэта не звыклыя «Сталічныя» ці «Беларускія», а цукеркі з міндалём і какосам, разлічаныя яўна на ахвотных усё паспытаць замежнікаў, якія не шкадуюць грошай. Такая крама, размешчаная на галоўным праспекце горада, ды яшчэ з немалой гісторыяй, можа стаць не толькі адным з любімых месцаў гараджан, але і абавязковым пунктам наведвання для турыстаў.

Не ўстаяўшы перад выглядам апетытных пірожных, рухаюся ў бок Верхняга горада. На ўваходзе нас дагледаюць ахоўнікі правапарадку. І калі беларусы часам успрымаюць гэта ў штыкі, то замежнікі, наадварот, з адабрэннем ківаюць: маўляў, адразу адчуваеш сябе больш абароненым.

Першае, што кідаецца ў вочы, — за пару гадзін да гэтага адкрыты помнік стваральнікам першай беларускай оперы Станіславу Манюшку і Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу. Да яго чарга чалавек 10—15 — усе хочуць сфатаграфавацца. Хоць у натоўпе, зноў падслухоўваю, і чуюцца рэплікі накшталт: «Не палічы мяне неадукаванай, але хто гэта такія?» або «А як называецца тая опера?» Каля помніка сапраўды хацелася б бачыць інфармацыйны стэнд, дзе расказваецца хоць бы сцісла пра жыццё і творчасць двух выдатных людзей. Самі беларусы, у якіх няма спецыяльнай адукацыі, мала што могуць паведаміць сваім замежным сябрам.


Фота «Мінск-навіны».
У час адкрыцця помніка С. Манюшку і В. Дуніну-Марцінкевічу.

Каля ратушы — невялікі горад майстроў. Відаць, што аўтары падрыхтаваліся да свята: лялькі з таблічкамі «Мінск, я цябе люблю», дэкаратыўныя талеркі з відамі сталіцы і нават завушніцы ў форме Нацыянальнай бібліятэкі. На плошчы Свабоды — баль: плаўна вальсуюць дамы і кавалеры ў адзенні XVIII стагоддзя. Калі абстрагавацца ад натоўпу, можна ў думках апынуцца ў Мінску двухвекавой даўніны. Падабенства дадае скульптура экіпажа, якая стала любімым месцам гульняў для дзяцей. Дарэчы, недалёка размясцілася і сапраўдная карэта. З ёй усе таксама імкнуцца сфатаграфавацца, а вось пракаціцца чамусьці не адважваюцца. Для тых, каго не задавальняюць пешыя прагулкі, ёсць яшчэ некалькі альтэрнатыўных варыянтаў. У Дзень горада для жыхароў і гасцей сталіцы стартаваў новы экскурсійны маршрут, галоўнае ў якім — незвычайны транспарт. На паркоўцы ярка-чырвоныя фаэтоны ГАЗ 69Л стаяць у шарэнзе — відовішча і праўда ўражвае. Можна адправіцца на экскурсію, прыцягваючы ўвагу прахожых сваім аўтатранспартам. Тэматыка традыцыйная: «Мінск сакральны», «Горад ваеннай славы», «Мінскімі вулачкамі». У машыну змяшчаецца 6 чалавек, на выбар прапанаваны аўдыягід (на рускай або англійскай мове) і прафесійны экскурсавод. У цэлым, у гэтай частцы горада вельмі ціха і спакойна, што асабліва радуе іншаземцаў, якія стаміліся ад шуму мегаполісаў.

А вось па меры набліжэння да тэрыторыі каля Палаца спорту гоман нарастае. Недалёка ад метро клоўн спрабуе навучыць фокусам дзяцей. На ўваходзе на тэрыторыю святкавання — зноў агляд. Далей — мноства гандлёвых пунктаў, чэргі невялікія, аднак за столікамі ўсе месцы занятыя. У паветры лунае пах шашлыкоў і салодкай ваты. Ёсць, вядома, і стравы нацыянальнай кухні. Для тых, хто сочыць за сваёй фігурай, нават прыдумалі дранікі, ад якіх нельга папраўіцца, — з кабачкоў і буракоў.

Горад майстроў тут займае вялізную плошчу: таксама зробленыя ўручную ўпрыгажэнні і сувеніры, аднак акцэнт са сталіцы змяшчаецца на нацыянальны каларыт. На ўзвышшы ўсталяваныя дзве велізарныя постаці, якія імітуюць саламяных лялек. У свеце, які звар'яцеў на глебе сацыяльных сетак, магчымасць зрабіць унікальныя фотаздымкі — вялікі плюс. Таму такія цікавыя аб'екты гораду неабходны, нездарма ж у інтэрнэце набіраюць усё большую папулярнасць маршруты прагулак, пабудаваныя з улікам магчымасці зрабіць найбольш удалыя фотаздымкі. Прызнаюся шчыра, і я не ўтрымалася: прастаяўшы хвілін 10 у чарзе, зрабіла фота з велізарнай лялькай.

**...Гасцінны гаспадар-беларус спрабаваў растлумачыць сям'і, відаць па ўсім, нямецкай, якая дружна аплятала тонкія блінцы, што такое верашчака.**

А на адным з мерапрыемстваў змагаліся за тытул чэмпіёна па сілавым экстрыме прадстаўнікі розных краін — дарэчы, выдатная магчымасць для замежнікаў «пахварэць» за землякоў і адчуць сябе не такім адзінокім у чужой краіне. Спаборнічалі, хто зможа падняць большую вагу. Відовішча гэта, шчыра кажучы, не для слабанервных. І ўсё ж нельга не прызнаць, што яно ўражвае: тыя, хто ўцягнуўся, не маглі пайсці да канца турніру.

Непадалёк — галоўная сцэна. Што толькі там не адбывалася на працягу ўсяго дня: ад выступленняў дзіцячых калектываў да канцэрта «Песняроў». Рэпертуар — на любы густ. На крэслах, ціха пагойдваючыся ў такт мелодыі, сядзяць бабулі, каля сцэны бегаюць дзеці. Як «іншаземцы» мне цікава паназіраць і за народнай творчасцю, і за моднымі маладзёжнымі плынямі, таму разнастайнасць сапраўды радуе.

Зусім побач з галоўнай сцэнай размясцілася пляцоўка для правядзення конкурсу «Жалезны пажарны». Вялізная канструкцыя, якая імітуе вышынны будынак, людзі-манекены, апранутыя ў форму ратаўнікоў — арганізатарам удалося ўзнавіць атмасферу рэальных вучэнняў. У паветры лунае напружанне: як толькі пажарныя атрымліваюць новае заданне, адразу забываеш, што гэта толькі гульня — здаецца, ідзе сапраўды барацьба за выжыванне. Падобнага роду мерапрыемствы, не тыповыя для іншых дзяржаў, могуць стаць візітнай карткай таго ж Дня горада ў Мінску. Таму, магчыма, «Жалезнаму пажарнаму» як значнай самастойнай падзеі варта было б вылучыць асобную пляцоўку. Мне ў якасці турысткі, якая ніколі не бачыла нічога падобнага, менавіта гэтая частка свята паказалася адной з найбольш уражальных.

Гандаль, песні, танцы, спаборніцтвы, смачная ежа, весялосць і шум... Хіба не адлюстроўвае разнастайнасць мерапрыемстваў шматграннасць амаль двухмільённага горада? Хутчэй за ўсё, так, але ўсё ж такі замежнікам (у гэтым выпадку і мне), якія ўбачылі Мінск падчас свят, будзе крыху складана ўявіць яго сапраўднае аблічча. Для гэтага варта трохі адысці ад галоўных плошчаў і атрымаць асалоду ад ціхамірнасці Свіслачы і спакою восеньскіх паркаў. І хто ведае, магчыма, з'явіцца яшчэ адна цудоўная песня, натхненнем для якой на гэты раз паслужыць наша сталіца.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*


Фота БЕЛТА.

## «ЗАЛАТЫ ФОНД» ГОРАДА

**Амаль 20 000 працоўных спаборнічалі за званне найлепшага ў сваёй прафесіі на конкурсе «Мінскі майстар — 2016». Першых у сваёй справе ўрача, вадзіцеля, кухара, следчага ўзнагародзілі, як пераможцаў, за ўклад у развіццё горада. Усяго 37 прадстаўнікоў розных прафесій сталі лаўрэатамі конкурсу. Старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ назваў іх «залатым фондам» сталіцы.**

— Мы аддаём належнае чалавеку працы, найбольш масавым прафесіям, якія ўплываюць і на эканоміку, і на жыццё кожнага з нас, — падкрэсліў **старшыня Мінскага гарадскога аб'яднання арганізацый прафсаюзаў Мікалай БЕЛАНОЎСКІ.** — У нас за гэтыя гады больш як 400 пераможцаў носяць званне «Мінскі майстар», і за кожнага з іх не сорамна, таму што яны нават неаднойчы здалі тэарэтычныя і выканалі практычныя іспыты. Фактычна гэта карціна нашага працоўнага горада. І мы ўдзячны ўсім людзям, якія добра працуюць, таму што менавіта праца дазваляе кожнаму з нас мець дом, вопратку, ежу і ганарыцца нашай краінай.

**Карына ВІНЬКО, акушэрка жаночай кансультацыі 14-й цэнтральнай раённай паліклінікі,** стала найлепшай у сваёй прафесіі і раскрыла нам сакрэты майстэрства:

— У акушэрстве важныя ўсе, нават самыя малазначныя, фактары. Гэта і досыць высокае развіццё медыцыны, і стаўленне людзей да свайго здароўя, і кампетэнтнасць лекараў і акушэрак. Нельга вылучыць нейкі дамінуючы фактар. Наш прафесійны конкурс праходзіў у тры этапы. На першым трэба было падаць у камісію справаздачу аб прафесійнай дзейнасці і партфоліа. Другі этап — конкурс прафесіянальнага майстэрства. Ён праходзіў у два туры. На першым мы адказвалі на тэставыя пытанні, а на другім — дэманстравалі прафесійныя навыкі. Трэці этап быў творчым, у ім мы раскрывалі тэмы «Я акушэрка, і гэта гучыць горда» і «Мая ўстанова — мая крэпасць».

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 07 октября 2016 года торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | - «лит.А1-2/к-кп, здание прачечной» общей площадью 1012 кв. м (инвентарный номер в ЕГРНИ 500/С-34660; назначение: здание неустановленного назначения) с элементами благоустройства: автодорога (540 кв. м), площадка под автостоянки (240 кв. м), пешеходная дорожка (206 кв. м), площадка под мусоросборник (4 кв. м), площадка (3 кв. м), бордюр 0,16 (40 кв. м, 251,22 м.п.), ограждение территории (16,40 м.п.), ограждение площадки под мусоросборник (5,50 м.п.), ворота (4,40 м.п.), ворота (7,60 м.п.); - электросети КЛ-0,4КВ (инвентарный номер по бухгалтерскому учету 3000842). |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Кабушкина, д. 64 |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь – 0,3900 га, кадастровый номер 500000000002001769, назначение – эксплуатация и обслуживание здания прачечной |
| **Продавец имущества** | ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов без учета НДС** | 894 514,19 бел. руб. (8 945 141 900 бел. руб. образца 2000 года) |
| **Сумма задатка** | 89 000 бел. руб. (890 000 000 бел. руб. образца 2000 года) |
| **Условия торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Дальнейшее использование приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в соответствии с требованиями регламентов генерального плана города Минска и градостроительного проекта детального проектирования соответствующей территории |
| **Наличие обременений** | Аренда |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **07 октября 2016 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 07.09.2016 по 05.10.2016 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017)327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017)217-21-03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).**

## РУП «Институт недвижимости и оценки»
## извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк»

| Лот № 1 | | | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | Цех по производству кондитерских изделий с инв. № 400/С-793. Общая площадь – 2 234,0 кв.м. Г.п. – 1980, 2006, 2007. Этажей – 1. Составные части и принадлежности: подвал (А1/к), три пристройки (Б1/бл, В1/бл), Г1/бл) | Гродненская обл., Гродненский р-н, Гожский с/с, д. Новая Гожа, 8 | 403 690,14 (4 036 901 400)* | 40 369,01 (403 690 140)* |

()* – Цена указана в денежных знаках образца 2000 г.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,8767 га с кадастровым номером 422082407901000058. Целевое назначение – для размещения объектов пищевой промышленности. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи не позднее 10 (десяти) дней с назначенной даты проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) вправе произвести оплату в размере 100% стоимости приобретенного на аукционе Объекта не позднее 30 (тридцати) дней с момента заключения договора купли-продажи.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 1% (Один процент) от цены продажи Лота №1 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Передача Объекта Победителю аукциона (Претенденту на покупку), заключившему договор купли-продажи, происходит по акту приема-передачи после внесения оплаты в размере 100% стоимости, приобретенного на аукционе Объекта.
Государственная регистрация перехода права собственности на Объект происходит в течение 7 (семи) рабочих дней после передачи имущества Победителю аукциона (Претенденту на покупку), заключившему договор купли-продажи.
Расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, заключением договора купли-продажи, государственной регистрацией перехода права собственности на Объект, а также регистрацией возникновения (перехода) соответствующего права на земельный участок несет Победитель аукциона (Претендент на покупку), заключивший договор купли-продажи.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 07.10.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by.**
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже цеха по производству кондитерских изделий, принадлежащего ОАО «Белинвестбанк», **проводимом 07 октября 2016 г.**
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений – **05.10.2016 в 10.00.**
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактные лица для осмотра Объекта: Товстик Дмитрий Константинович, 8 (017) 236-59-00 (г. Минск), Лапыш Андрей Валерьевич, 8 (0152) 79-02-30, 8 (029) 383-86-46 (г. Гродно).
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ОАО «Дорстройиндустрия»
## извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества

| Лот №1 | | | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток с НДС, бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| **Лот №1** | **Оборудование II технологической линии щебеночного завода г. Фаниполь** | **Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 37** | **281 079 рублей 78 копеек** | **28 107 рублей 98 копеек** | **5** |

**ОПИСАНИЕ**

**19 единиц оборудования: питатель вибрационный ДРО-605-20 (инв. № 4249); два агрегата мелкого дробления ДРО 702-10 (инв. №№ 4250, 4251); агрегат сортировки ДРО-690 (инв. № 4255); агрегат грануляции ДРО-630 (инв. № 4259); агрегат сортировки ДРО-669 (инв. № 4261); железоотделитель ЭЖС-80 (инв. № 4266); конвейер специальный СМД-151-80 (инв. № 4267); шесть конвейеров специальных СМД-151-60 (инв. №№ 4269, 4270, 4271, 4272, 4273, 4275); три конвейера специальных СМД-151-50 (инв. №№ 4283, 4284, 4285); конвейер специальный ДРО-596-10 (инв. № 4291), операторская У-78104А инв. № 4263).**

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот №1 по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Лот № 1 в течение 5 (пяти) календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота №1: первоначальный платеж в размере 50% от стоимости приобретенного оборудования в течение 10 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи, оставшиеся 50% – с рассрочкой до конца 2016 года.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 20.09.2016 в 11.00 по адресу: г. Фаниполь, ул. Заводская, д. 1, 3 этаж, актовый зал.**

С информацией об условиях проведения аукциона, порядке возврата задатка, условиях участия в аукционе можно ознакомиться в извещении, размещенном в газете «Звязда» от 11.06.2016 г.
Задаток перечисляется на р/с 3012421830016 БИК 153001942 в Расчетно-кассовом центре № 29 в г. Фаниполь филиала ОАО «Белагропромбанк» – Минское областное управление г. Фаниполь, ул. Заводская, 3а, 222750. Получатель – ОАО «Дорстройиндустрия», УНП 100211220, ОКПО 03455184.
Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Дорстройиндустрия» (Лот №1), **проводимом 20 сентября 2016 года.**
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.00 до 12.00, с 13.00 до 17.00 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 1, каб. 202.
Окончание приема заявлений – **16.09.2016 в 17.00.**
Заключительная регистрация участников **20.09.2016 с 08.30 до 11.00** по месту проведения аукциона.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом (Объектами). Контактное лицо для осмотра Объекта: Мазюкевич Дмитрий Николаевич 8 (033) 300-23-28.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор: 8 (017) 210-00-60, 8 (033) 660 70 50 • www.dsi.by • e-mail: jurist@dsi.by**

Извещение о проведении аукциона по продаже в частную собственность гражданам Республики Беларусь земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

## ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – ИВЕНЕЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Расходы по документации (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Петрусовщина, кадастровый номер 622084607101000052 | 0,25 га | Подъездные пути, рядом лес, ЛЭП | 2 491 | 498 | 77,7 |

*Задаток перечисляется на р/счет 3600614030501 в ГУ МФ РБ по Минской области ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 795, УНП 600537220, Ивенецкий сельский исполнительный комитет, код платежа – 04901.*

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации и объявления в газету.

**Аукцион состоится 5 октября 2016 года в 10.00 по адресу: Воложинский район, г.п. Ивенец, пл. Свободы, 2.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются **до 30.09.2016 г. до 17.00** по адресу: Воложинский район, г.п. Ивенец. пл. Свободы, 2.

Контактные телефоны: (801772) 53388, 51843.

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## «Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№1 по генплану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» I очередь строительства, 6-11 секции, II очередь строительства, секции 1-3)» 3-4 пусковой комплекс

**Застройщик:** Общество с ограниченной ответственностью «ДАТЧ СТАР» зарегистрировано Минским горисполкомом 09.09.2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №191061436.

Местонахождение: Республика Беларусь, 220089, г. Минск, ул. 3-я Щорса, 9, офис 505.

**Тел.:** +375 (44) 5343000, +375 (29) 1533324.

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник–пятница с 9.00 до 18.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

**Информация о проекте строительства.**

**Цель строительства** – строительство «Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№1 по генплану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» 1-я очередь.

Строительство осуществляется с выделением следующих этапов:

первая очередь строительства: 6-7 секции;

начало строительства – 26.10.2015 года, предполагаемый срок ввода в эксплуатацию – 09.06.2017.

**Застройщиком получены:**

- решение Минского городского исполнительного комитета № 1525 от 11.06.2015 г.;
- экспертное заключение № 478-15/14И от 27.06.2014;
- разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-203Ж-028/15 от 26.10.2015;
- договор строительного подряда № 22.06.2013 г. от 22.06.2013, заключенный с СООО «СтройМонолит».

**Информация об объекте:**

**Жилой дом** расположен в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского г. Минска. Проектом предусматривается строительство 128-квартирного, 18-этажного жилого дома, со встроенными объектами обслуживания населения, с подземной гараж-стоянкой на 56 м/мест, техэтажом, помещением ТС, остекленными лоджиями. Все квартиры запроектированы по принципу «свободной планировки». Принятая конструктивная схема с монолитным каркасом и заполнением ненесущих наружных и внутренних стен блоками. Наружная отделка – атмосферостойкие штукатурки с последующей окраской фасадными красками, 1-2-й этажи – вентилируемый фасад с отделкой из керамогранита. Окна ПВХ, застекленные лоджии. В помещениях квартир чистовая отделка и покрытие пола проектом не предусматривается. Жилой дом оборудован 2 лифтами в каждой секции.

Помещения в доме, не входящие в состав общего имущества: помещения общественного назначения и объекты, которые служат использованию этих помещений (коридоры, тамбуры, санузлы и подсобные помещения).

**В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности,** после ввода в эксплуатацию жилого дома и передаче дольщикам объектов долевого строительства, входят:

помещения инженерного назначения; межквартирные лестничные клетки, лифтовые холлы, вестибюли, лифты, конструкции дома, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства.

В элементы благоустройства и озеленения проектом предусматривается устройство тротуаров, пешеходных дорожек, размещение площадок: детской игровой, для отдыха взрослых, сбора мусора, устройство газонов, посадка деревьев и кустарников.

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:**

**6(шесть) однокомнатных квартир по принципу «свободной планировки» площадью от 38,41 до 38,45 кв.м: стоимость 1 кв. метра от 960 до 1100 долларов США;**

**12(двенадцать) двухкомнатных квартир по принципу «свободной планировки» площадью от 62,38 до 64,38 кв.м: стоимость 1 кв. метра от 900 до 1000 долларов США;**

**6(шесть) трехкомнатных квартир по принципу «свободной планировки» площадью от 82,68 до 84,53 кв.м: стоимость 1 кв. метра от 850 до 930 долларов США.**

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади и условий оплаты строящегося жилого дома.

Оплата производится в белорусских рублях по курсу НБ РБ на день оплаты. Данные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации и при условии наличия данных квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.

**Условия оплаты** – первоначальный взнос в течение 5 календарных дней с момента регистрации договора долевого строительства в Мингорисполкоме, рассрочка до ввода объекта в эксплуатацию.

Ознакомление дольщиков с планировками квартир, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется по предварительной договоренности в рабочее время ООО «ДАТЧ СТАР» по адресу: г. Минск, ул. 3-я Щорса, 9, офис 505. Тел.: +375 (44) 5343000, +375 (29) 1533324.

Информацию об объекте, планы квартир и нежилых помещений смотрите также на сайте организации ООО «ДАТЧ СТАР» **www.grandhouse.by.**

# А МОГ БЫЦЬ ІНФАРКТ...

## Тэрміновы зварот па медыцынскую дапамогу здольны прадухіліць сасудзістую катастрофу

**Цяжка сабе ўявіць чалавека, які дажыў да 40 гадоў і не здагадваецца, дзе ў яго сэрца: часам яно заяўляе пра сябе болем. Гэта ў любым выпадку нагода для абследавання і разваг над сваім ладам жыцця, аднак боль у грудзях бывае такім, што планаваць візіт да ўрача ўжо няма калі — трэба выклікаць «хуткую».**



### ШТО ЗА БОЛЬ?

Ён мацнейшы, чым калі-небудзь. Можа аддаваць у руку, сківаіцу, дапаўняцца задышкай і галавакружэннем. Ігнараваць такія сімптомы нельга нікому, але ў першую чаргу тым, хто курыць, мае высокі ціск, лішнюю вагу, павышаны халестэрын, тым больш ішэмічную хваробу сэрца, бо асноўная праява гэтага захворвання — менавіта боль за грудзінай. З болем такія людзі вельмі добра знаёмыя, аднак на гэты раз ён іншы. «Звычайны» доўжыцца літаральна 1-2 хвіліны і знімаецца нітрагліцэрынам, а моцны не рэагуе ні на нітрагліцэрын, ні на разжаваны аспірын. Не марнуйце час — не чакайце панядзелка, раніцы ці сваякоў з працы! Вас напаткала рэальная пагроза жыццю — сасудзістая катастрофа, інфаркт міякарда, падчас якога можа развівацца арытмія, страта прытомнасці, і «хуткая» ўжо не дапаможа.

Практыка паказвае, што большая частка людзей упарта трываюць і толькі праз некалькі дзён (калі не тыдняў!) адважваюцца зрабіць электракардыяграму, якая, між іншым, не заўсёды дазваляе западозрыць такое захворванне, як інфаркт міякарда. Словам, зноў страта часу...

— Залаты стандарт аказання дапамогі пацыенту з такім болем — 90 хвілін ад моманту звароту да медыкаў, — тлумачыць **загадчыца інфарктнага аддзялення №2 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска Наталля ПАЛЯЎКОВА.** — Інфаркту там яшчэ можа не быць — гэта працэс не імгненны, а таму спецыялісты ў такіх выпадках кажуць пра сасудзістую катастрофу, або востры каранарны сіндром. Такім чынам, «хуткая дапамога» павінна ў першыя гадзіны захворвання даставіць пацыента ў стацыянар, дзе ёсць спецыяльны апарат — ангіёграф. Сёння такія ёсць у 1-й, 4-й, 9-й, 10-й гарадскіх бальніцах, бальніцы хуткай дапамогі, РНПЦ «Кардыялогія», а таксама ва ўсіх абласных і некаторых буйных гарадах. У стацыянары хвораму ў любым выпадку зробяць кардыяграму і абавязкова возьмуць аналізы крыві. Выяўленне ў крыві спецыфічнага ферменту будзе сведчыць аб наяўнасці пашкоджання сардэчнай мышцы і маштабе сасудзістай катастрофы...

Востры, нясцерпны боль — сімптом не толькі самога інфаркту міякарда, але і так званай нестабільнай стэнакардыі. У большасці выпадкаў прычынай з'яўляецца халестэрынавая бляшка, якая перакрывае прасвет сасуда не поўнасцю, але ў любое імгненне можа дэфармавацца токам крыві і перакрыць яго цалкам, а гэта ўжо інфаркт. Хворы ж у любым выпадку адчувае толькі боль і не ведае, што адбываецца ў сэрцы. Для яго важней усвядоміць толькі адно: чым даўжэй застаешся без медыцынскай дапамогі, тым горш. Спачатку страчваеш шанц прадухіліць інфаркт у прынцыпе, праз нейкі час — атрымаць дробны ачаг замест буйнога, яшчэ праз колькі можна наогул пазбавіць сябе магчымасці ратавання.



**Час правядзення каранаграфіі пры падазрэнні на інфаркт міякарда абмежаваны некалькімі гадзінамі. А папярэдзіць развіццё інфаркту магчыма толькі цягам першых 90 хвілін ад пачатку захворвання.**

«Клеткі сэрца гінуць у выніку закупоркі сасуда не адразу, яны становяцца нібыта «аглушанымі». Калі хутка аднавіць крываток, то клеткі яшчэ могуць прачнуцца, і гаварыць пра інфаркт не давядзецца», — удакладняе Наталля Якаўлеўна.

Пазней магчымасць выдаліць прычыну страчваецца і для змагання з наступствамі застаецца малаэфектыўная медыкаментозная тэрапія. Між тым можна было правесці даабследаванне на вышэйзгаданым ангіёграфе. Гэты апарат дазваляе ўбачыць, які сасуд і наколькі звужаны, а пасля і выканаць маніпуляцыі па аднаўленні крыватоку. Такі метад абследавання і лячэння называецца каранаграфіяй.



### ТРЭБА ПАГАДЖАЦЦА

Выконваецца каранаграфія пры пісьмовай згодзе пацыента. З аднаго боку, гэта проста абследаванне, але ж яно можа тут жа перайсці ў аперацыю, бо калі ўрач-рэнтгенаэндаваскулярны хірург выявіць тромб, яго неабходна будзе выдаліць, а пасля абавязкова аднавіць крываток з дапамогай такой аперацыі, як стэнтаванне.

Нам з фотакарэспандэнтам удалося пабачыць на свае вочы, як усё гэта выглядае. Каб трапіць у аперацыйную падчас абследавання, давялося пераадзецца. На сябе трэба было таксама павесіць ахоўныя — цяжкія, кілаграмаў па дванаццаць, фартухі, якія закрываюць цела ад шыі да ног. Нездарма на дзвярах блока красуецца значок радыяцыйнай абароны. Каранаграфія патрабуе рэнтгеналагічнага кантролю, дзякуючы якому на велізарным маніторы можна бачыць сэрца і сасуды, як уласныя рукі. **Аперацыйная медсястра Ала КАРПОВІЧ** надзела яшчэ спецыяльныя акуляры для абароны вачэй. Як высветлілася, акуляры гэтыя здольныя запацяваць, рот і нос закрытыя павязкай... Словам, мне праз пару хвілін захацелася выйсці і аддыхацца. А даследаванне яшчэ толькі пачалося.

Як і належыць, наш 64-гадовы пацыент перад тым, як трапіць на аперацыйны стол, падпісаў «інфармаваную згоду на правядзенне каранаравентрыкулаграфіі і наступных неабходных інвазіўных і кардыяхірургічных умяшанняў». На гэтым лісце напісана асноўнае, што трэба ведаць пацыенту.

Праз артэрыю сцягна або пляча пад мясцовай анестэзіяй навакаінам ці лідакаінам уводзяцца спецыяльныя катэтары, якія ўстанаўліваюцца ў розных аддзелах сэрца. **Рэнтгенаэндаваскулярны хірург Сяргей ВАЦУРА** ўводзіць кантраснае рэчыва, якое запаўняе прасвет артэрый і адну з поласцяў сэрца.

— Пацыент можа адчуваць невялікі боль у месцы пункцыі падчас правядзення мясцовага абязбольвання, а таксама гарачыню падчас увядзення кантраснага рэчыва, — тлумачыць Наталля Паляўкова. — Паводле сусветных даных, рызыка ўскладненняў пры такім абследаванні вельмі і вельмі невялікая. Напрыклад, у 1,6 % хворых бываюць ускладненні ў месцы пункцыі, што можа запатрабаваць хірургічнага лячэння або пералівання крыві. Аднак і гэта палохае нашых пацыентаў, як і тое, што адразу пасля маніпуляцыі неабходна захоўваць гарызантальнае становішча цягам 12 гадзін. Між тым рызыка небяспечных для жыцця ўскладненняў, звязаных з тым захворваннем, якое ўжо ёсць, на парадак вышэйшая...



Фота Надзеі БУЖАН.

### АРТЭРЫЮ АДКРЫЛІ!

Рэнтгенаэндаваскулярны хірург падчас каранаграфіі можа дакладна сказаць, якое лячэнне палепшыць якасць жыцця канкрэтнага пацыента — працяг медыкаментознай тэрапіі, ангіяпластыка са стэнтаваннем або аортакаранарнае шунціраванне. **Ангіяпластыка і стэнтаванне артэрый сэрца з'яўляецца сёння самым эфектыўным метадам лячэння ішэмічнай хваробы сэрца.** Немалаважна, што такое ўмяшанне можна паўтараць некалькі разоў цягам жыцця.

Сутнасць методыкі заключаецца ў пашырэнні звужанага прасвету спецыяльным балонным катэтарам, які падводзіцца непасрэдна да бляшкі. Балон раздзьмуваецца пад ціскам, і бляшка расплюшчваецца, а для таго, каб гэты ўчастак заставаўся пашыраным як мага даўжэй, сценкі ўмацоўваюць металічным сеткавым каркасам — стэнтам. Балон жа пры гэтым выдаляецца. Эфект ад такога ўмяшання залежыць не толькі ад устаноўкі стэнта, але і ад далейшага прыёму шэрагу медыкаментаў. Неабходна таксама строга кантраляваць артэрыяльны ціск, не курыць і абмежаваць алкаголь, рэгулярна займацца фізкультурай (хада, лячэбныя практыкаванні), сачыць за харчаваннем (рэзка скараціць ужыванне тлустага мяса, сала, смятаны, масла).

Наш пацыент паступіў з дыягназам «прагрэсуючая стэнакардыя». Боль за грудзінай яго непакоіў тыдні два-тры, паступова нарастаў і пачаў з'яўляцца нават пры нязначнай фізічнай нагрузцы. Ніякага лячэння мужчына не прымаў, хоць у яго і артэрыяльная гіпертэнзія, і цукровы дыябет, і курыць ён не кінуў. Каб ацаніць ступень пашкоджання артэрый сэрца, вызначыцца з далейшай тактыкай лячэння, было прынята рашэнне аб правядзенні каранаграфіі.

— Вось мы бачым атэрасклератычнае пашкоджанне каранарных артэрый, ступень звужэння — больш за 95 працэнтаў, — паказвае на манітор і тлумачыць **загадчыца ангіяграфічнага кабінета Вольга ЖЫХ.** — Калі б пацыент не выклікаў «хуткую» і не трапіў у стацыянар, то ў яго неўзабаве развіўся б буйнаачаговы інфаркт. Пацыенту будзе выконвацца ангіяпластыка. Дапамога такога кшталту абыходзіцца бюджэту ў суму ад 1,5 тысячы долараў, той жа стэнт можа каштаваць ад некалькіх соцень да некалькіх тысяч долараў...

Завяршаюцца такія аперацыя кантрольным здымкам. Пасля выдалення інструментарыя хірург прыціскае пальцам месца пракола і трымае ад 10 да 40 хвілін, у залежнасці ад таго, як хутка згусае ў пацыента кроў. На суткі накладваецца тугая павязка. Крываток адноўлены, ускладненняў няма, пацыента адвозяць на каталцы ў аддзяленне інтэнсіўнай тэрапіі, дзе ён прабудзе пад пастаянным назіраннем суткі. У гэты час яму нельга садзіцца і стаяць. Звычайна такія пацыенты знаходзяцца ў стацыянары 12-14 дзён, затым адпраўляюцца на рэабілітацыю.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

### Абарона ад бляшак

У дзіцячым узросце халестэрын лёгка змываецца з артэрый, аднак нездаровы лад жыцця спрыяе таму, што сценкі сасудаў проста прыцягваюць да сябе тлушчавае рэчыва, якое пасля замацавання ўжо называецца бляшкай, будзе расці і тым самым павялічваць рызыку сасудзістай катастрофы. Як толькі артэрыя перакрыецца больш як на 40 працэнтаў, гэта стане заўважным для чалавека: падчас фізічнай нагрузкі з'явіцца задышка і боль. Такім чынам, чым большая бляшка, тым горш. Аднак і не надта вялікая можа з нейкай прычыны адарвацца і заблакіраваць у больш вузкім месцы ток крыві. Там, дзе яна адарвалася, сітуацыя будзе не лепшай. У месца траўмы збягуцца «ліквідатары аварыі» — трамбацыты, яны ўтвораць тромб, і, зноў жа, атрымаецца спыненне крыватоку.

Змагацца з халестэрынавымі адкладаннямі няпроста. Першая ўмова — здаровы лад жыцця. Другая — ужыванне спецыяльных медпрэпаратаў, напрыклад стацінаў. Разбурыць тое, што ўтварылася, ім не па сілах, затое яны могуць папярэдзіць утварэнне новых бляшак і ўмацаваць тыя, што ёсць, каб яны не адрываліся.

Дарэчы будзе прыгадаць адно назіранне індыйскіх даследчыкаў. Хворых, якія перажылі закупорку сасудаў і якім былі праведзены медыцынскія маніпуляцыі па аднаўленні крыватоку, падзялілі на дзве групы. Абедзвюм рэкамендавалі сачыць за дыетай, сном (рана класціся і рана ўставаць), ужываць лекі, займацца медытацыяй і фізічнымі практыкаваннямі, не курыць і не злоўжываць алкаголем. Але адну групу пры гэтым спецыялісты жорстка кантралявалі. Па завяршэнні эксперымента менавіта ў гэтых паддоследных не толькі не ўтварылася новых бляшак, але і зменшыліся старыя, і адпала неабходнасць у запланаваных раней хірургічных умяшаннях.

# ЛІХАМАНКА СТАРОГА СВЕТУ



## Еўропу апанавала імкненне да дэцэнтралізацыі

**На наступным тыдні ў Браціславе запланавана правесці чарговы саміт Еўрасаюза. Мерапрыемства насамрэч гістарычнае, бо ўпершыню пройдзе без удзелу Вялікабрытаніі, якая падчас чэрвеньскага рэферэндуму выказалася за выхад з ЕС. Акрамя гэтага, на прасторы Старога Свету назбіралася шмат іншых «прыкмет часу» і супярэчнасцяў. Якія, зразумела, будуць абмеркаваны падчас саміту. Адзін з устойлівых трэндаў — імкненне да дэцэнтралізацыі, стварэнне рознага кшталту саюзаў і груповак краін. Нездарма канцлер Германіі Ангела Меркель напярэдадні форуму вельмі актыўна ажыццяўляла рабочыя паездкі, падчас якіх сустракалася з кіраўнікамі еўрапейскіх краін. Як і належыць фактычнаму лідару Еўропы, дамінаванне якога ўзмацнілася пасля брэксіту, Меркель вымушана адпавядаць свайму новаму становішчу. З іншага боку, шэраг экспертаў угледзелі тут імкненне «фраў канцлярын» дэталёва на месцы вывучыць сітуацыю са стварэннем рэгіянальных груповак і саюзаў. Ці ўдасца Старому Свету захаваць агульны саюз і не «раскрышыцца» з цягам часу на асобныя кавалкі?**

### Меркель тут, Меркель там

Маршрут Ангелы Меркель атрымаўся надзвычай цікавым. Яна пабывала ў Таліне і Празе, а на наступны дзень ужо завітала ў Варшаву, дзе прайшла сустрэча Вышаградскай чацвёркі (V4). Як вядома, гэтае дзяржаўнае аб'яднанне складаецца пасля распаду Чэхаславакіі з чатырох краін: Польшчы, Венгрыі, Славакіі і Чэхіі. Дарэчы, сёлета яно адзначае 25-гадовы юбілей. V4 адыгрывае ўсё больш важную ролю ў еўрапейскіх справах. Лідары чатырох усходнееўрапейскіх краін рэгулярна збіраюцца перад еэсаўскімі самітамі, каб выпрацаваць агульную пазіцыю па найбольш важных пытаннях. Нягледзячы на існуючыя рознагалоссі паміж членамі V4, групаператварылася ў сур'ёзнага гульца ў еўрапейскай палітыцы, актыўнасць і значэнне якога з кожным годам узрастае.

Вядома, галоўнай і найбольш цяжкай была сустрэча Ангелы Меркель у Варшаве з кіраўніком польскага кабінета Беатай Шыдло. Яна прайшла ў напружанай атмасферы. Адносіны паміж Варшавай і Берлінам былі бясхмарнымі яшчэ менш за год таму, калі ва ўладзе ў Польшчы знаходзілася ліберальна-кансерватыўная партыя «Грамадзянская платформа». Аднак яны рэзка сапсаваліся пасля перамогі на парламенцкіх выбарах у кастрычніку 2015 года правых нацыяналістаў з партыі «Права і справядлівасць» на чале з Яраславам Качыньскім.

Польшча, самы блізкі саюзнік ЗША ва Усходняй Еўропе, вельмі не задаволена Берлінам. Асцярожная пазіцыя Германіі не дазваляе ёй цалкам мілітарызаваць усходнюю мяжу ЕС з Расіяй пры дапамозе войскаў НАТА. Да гэтых рознагалоссяў, вядома, дадаліся гістарычныя супярэчнасці паміж Польшчай і Германіяй, якія сталі ўжо традыцыйнымі, а таксама новыя праблемы. У прыватнасці, праект будаўніцтва другой чаргі газаправода Nord Stream 2, які павінен звязаць Расію з Германіяй у абход Польшчы.

Да таго ж сустрэча двух кіраўнікоў урадаў у спадніцах праходзіла пад акампанемент дадзенага міністрам замежных спраў Польшчы Вітольдам Вашчыкоўскім інтэрв'ю, напоўненага антыгерманскай рыторыкай і абвінавачваннямі ў эгаізме. «Часта мы бачым намер пераследаваць толькі свае інтарэсы, — патлумачыў міністр карэспандэнту нямецкага інфармацыйнага агенцтва DPA. — Вядома, кожная краіна мае на гэта права, але часам мы ўсё ж спадзяёмся па пэўных пытаннях знайсці ў Берліна жаданне шукаць кампрамісы». Галоўны польскі дыпламат тут відавочна меў на ўвазе праблему з мігрантамі, пытанне, якое раскалола аб'яднаную Еўропу на два лагеры — прыхільнікаў прыёму бежанцаў з Афрыкі і Азіі і праціўнікаў. Першых узначальвае Ангела Меркель, а другія ў асноўнай сваёй масе знаходзяцца на ўсходзе кантынента.

Члены Вышаградскай чацвёркі зноў выказаліся супраць абавязковых квот па прыёме бежанцаў. Кіраўнікі ўрадаў Венгрыі, Польшчы, Славакіі і Чэхіі не раз крытыкавалі Брусель, падкрэсліваючы свае, адрозныя ад кіраўніцтва ЕС, погляды на міграцыйную палітыку. Канцлер Германіі адзначыла, што для падрыхтоўкі запланаванай сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў ЕС неабходна, каб палітыкі аб'яднанай Еўропы маглі «пачуць адзін аднаго ў розных фарматах». У той жа час яна дадала, што падчас гэтага саміту не будзе прынята якіх-небудзь важных рашэнняў пра будучыню ЕС. Іх варта чакаць налета, калі будзе адзначацца 60-годдзе Рымскага дагавора, які заклаў асновы для еўрапейскай інтэграцыі, падкрэсліў кіраўнік урада Славакіі Роберт Фіцо. Пасля перамоў у Варшаве і абеду з лідарамі V4 — сустрэчы з еўрапейскім усходам — Меркель сустрэлася з поўначчу кантынента. У Берліне прайшлі перамовы нямецкага канцлера з калегамі з Даніі, Фінляндыі, Швецыі і Нідэрландаў. Таксама Ангела Меркель сустрэлася з лідарамі Аўстрыі, Балгарыі, Харватыі і Славеніі.

Як бачым, спадарыня Меркель апошнім часам круціцца як вавёрка ў коле. Надзвычай напружаны графік выкліканы яе жаданнем змяніць імідж. Нямецкая лідарка хоча стварыць вобраз не дыктатара, якім яе бачаць многія еўрапейцы, асабліва на ўсходзе і поўдні кантынента, а цярплівай «слухачкі», якая ўважліва прыслухоўваецца да чужых думак і прымае рашэнні выключна на аснове кансенсусу і поглядаў суразмоўцаў. Канцлер раптам пакорліва загаварыла на сустрэчах з партнёрамі ў Таліне, Празе, Варшаве і Берліне пра «фазу слухаць, разумець, вучыцца адзін у аднаго, каб правільна выстройваць і развіваць натуральны новы баланс ўнутры саюза 27-мі». Але пакуль немецiць нейкую агульную дыскусійную платформу для Браціславы не ўдалося, акрамя дэкларававаных намераў захаваць ЕС без Вялікабрытаніі.




### «Рэцэпт» ад Бенілюкса

У Берліне Меркель абмеркавала крытычную сітуацыю ў ЕС з кіраўніком Еўракамісіі Жан-Клодам Юнкерам. А напярэдадні мінулага тыдня яна адправілася ў Эвіян, дзе правяла перамовы з прэзідэнтам Францыі Франсуа Аландам, у цэнтры якіх зноўтакі аказаліся тэмы міжнароднай і еўрапейскай палітыкі. Відавочна, што сама канцлер разумее: многае ўжо не так, як было 31 жніўня мінулага года, калі яна ўпершыню сказала на прэс-канферэнцыі ў Берліне словы «Мы справімся», якія сталі мантрай і адкрылі межы Германіі мільённай плыні бежанцаў. Баварскі лідар Хорст Зеехофер тады адразу назваў гэтае рашэнне памылкай. І вось ужо цягам года давер немцаў да палітыкі Меркель змяншаецца. Гэта пацвярджаюць вынікі апытання, праведзенага інстытутам Emnid. Паводле яго даных, палова немцаў не хочуць чацвёртага тэрміну Меркель пасля бундэстагаўскіх выбараў-2017.

А ў Аўстрыі выбарчая кампанія ўступае ў завяршальную стадыю. Аўстрыйская партыя свабоды (FPO) перастала агітаваць за «острэксіт» — выхад краіны з Еўрасаюза. «Па галоўных пытаннях мы павінны працаваць у больш цесным супрацоўніцтве», — цытуе агенцтва Bloomberg Норберта Хофера, які прайграў на прэзідэнцкіх выбарах у красавіку-маі гэтага года. Кандыдат ад Партыі свабоды растлумачыў, што пад «галоўнымі пытаннямі» ён мае на ўвазе ўмацаванне бяспекі і эканомікі Еўропы. Ёсць у Хофера рэцэпт і для павышэння аўтарытэту і вагі Аўстрыі ў агульнаеўрапейскіх справах. Кандыдат не прыдумаў нічога лепшага, як прапанаваць стварыць яшчэ адну нефармальную групоўку дзяржаў унутры ЕС — «саюз унутры саюза» ў складзе Аўстрыі, Славеніі, Харватыі, Чэхіі і Венгрыі.

Відавочна, што яшчэ нядаўна вельмі распаўсюджанае і папулярнае словазлучэнне «аб'яднаная Еўропа» з кожным днём усё больш страчвае сэнс, таму што Еўрасаюз у літаральным сэнсе «расцягваюць» на саюзы паменш. Апроч Вышаградскай групы, можна прыгадаць яшчэ і так званы Веймарскі трохвугольнік (Германія, Францыя і Польшча). Ёсць яшчэ Бенілюкс (Бельгія, Нідэрланды і Люксембург) — мабыць, найстарэйшая група дзяржаў на кантыненце. Грэцыя прапануе таксама стварыць Паўднёвую групу, у якую могуць увайсці балканскія краіны і, не выключана, Францыя. Усе гэтыя групоўкі і саюзы ствараюцца для ўзгаднення пазіцый па важных пытаннях. Хофер лічыць, што яны дапамагаюць невялікім краінам паспяхова адстойваць свае інтарэсы ў Бруселі. Гэта наглядна відаць, паводле яго слоў, на прыкладзе таго ж Бенілюкса.




### Кавалкі імперыі

Па актуальных найвастрэйшых тэмах, як рэфармаваць супольнасць, пануе густы туман. Прасвечвае толькі нежаданне многіх краін пашыраць паўнамоцтвы Брусеяля і прытрымлівацца ідэі «больш Еўропы». Лідары шасці паўднёваеўрапейскіх краін пацвердзілі ўдзел 9 верасня ў саміце ў Афінах, які павінен выступіць супраць палітыкі аскетызму і стаць процівагай Вышаградскай чацвёрцы, паведаміла крыніца ва ўрадзе. На саміт запрошаны прэзідэнт Францыі Франсуа Аланд, прэм'ер-міністры Італіі Матэа Рэнца і Партугаліі Антоніу Кошта, выканаўца абавязкаў прэм'ера Іспаніі Марыяна Рахой, прэзідэнт Кіпра Нікас Анастасіядзіс, прэм'ер Мальты Джозэф Мускат. Мэта прэм'ера Грэцыі Алексіса Цыпраса — стварыць альянс супраць палітыкі жорсткай эканоміі.

Правесці сустрэчу плануецца ў палацы Запіён, пабудаваным да першых Алімпійскіх гульняў 1896 года, які з'яўляецца адным з найбольш вядомых архітэктурных помнікаў Афін. «Гэта даўняя мара Цыпраса — сабраць краіны Поўдня Еўропы і стварыць моцны саюз супраць палітыкі аскетызму. Асноўная мэта — вывучыць магчымасць міжземнаморскіх краін аказваць уплыў на еўрапейскі парадак дня па такіх пытаннях, як сацыяльнае развіццё, міграцыйная палітыка», — паведамілі інфармагенцтвы са спасылкай на крыніцу ў грэчаскім урадзе. Паводле слоў суразмоўцы, такі крок стане процівагай крайне правай палітыцы шэрагу новых краін ЕС, якія ўваходзяць у Вышаградскую чацвёрку і патрабуюць правядзення палітыкі жорсткай эканоміі. «Гэта павінен быць анты-Вышаград. Саміт заклікаНы падкрэсліць, што Паўднёвая Еўропа мае вельмі вялікія праблемы і трэба змяняць сітуацыю, адмовіцца ад палітыкі, якую праводзяць краіны Цэнтральнай Еўропы пад кіраўніцтвам Германіі», — лічаць у грэчаскім урадзе.

Каментуючы ўдзел Рахоя, суразмоўца агенцтва адзначыў, што, хоць гэта і правы палітык, ён разумее, што палітыка аскетызму не можа працягвацца і надалей. Суразмоўца заявіў таксама, што саміт не выпадкова будзе праходзіць у адзін дзень з пасяджэннем Еўрагрупы. «Гэта будзе сігнал — спыніце ціск на Грэцыю, у нас ёсць падтрымка іншых краін», — заўважылі ў грэчаскім урадзе. Акрамя гэтага, тут ёсць яшчэ адзін знак — паўднёваеўрапейскія лідары збяруцца за тыдзень да вызначанага на 16 верасня нефармальнага саміту 27 краін ЕС у Браціславе.

Характэрна, што «Усходняя Еўропа» маецца і ў самой Германіі. Гэта ўсходнія землі, былая ГДР. Тут захаваўся архаічны, каранёвы падыход (Blut und Boden — «Кроў і глеба») да асноўных праблем грамадскага жыцця, тут мацней за ўсё пратэстуюць супраць наплыву мігрантаў і ўзнік знакаміты рух Pegida («Патрыятычныя еўрапейцы супраць ісламізацыі Захаду»). Самае цікавае заключаецца ў тым, што 40 гадоў сацыялізму значна менш змянілі традыцыйную свядомасць усходніх немцаў, чым узмоцненая амерыканізацыя і мадэрнізацыя Заходняй Германіі.

Хоць прагнозы скептыкаў, якія прадракалі пасля чэрвеньскага рэферэндуму ў Вялікабрытаніі аб членстве Лондана ў ЕС хуткі распад аб'яднання, не апраўдаліся і Еўрасаюз выстаяў, але мацнейшым ён, натуральна, не стаў. Наадварот, пасля брэксіту ён стаў яшчэ больш раздробленым і падзеленым на блокі і групы: Захад, які кааперыруецца па большасці пытанняў з Поўначчу (дзе, дарэчы, таксама апошнім часам нярэдка ўзнікаюць пратэсныя настроі), і Усход, які ўсё часцей займае аднолькавую пазіцыю з Поўднем. Аналітыкі небеспадстаўна лічаць, што цэнтрабежныя сілы здольныя прывесці да развалу як мінімум Шэнгенскай зоны, а ў канчатковым выніку і ЕС. Гэта будзе азначаць крах вялікага еўрапейскага праекта, што ў сваю чаргу прывядзе да тэктанічных зрухаў ва ўсёй сусветнай палітыцы.

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*

# БЕГЛА ЎСЯ СТАЛІЦА

## МІНСКІ ПАЎМАРАФОН ПАБІЎ АДРАЗУ НЕКАЛЬКІ РЭКОРДАЎ



**У гэтым годзе ўдзельнікамі маштабнага забегу сталі 20 тысяч чалавек — як прафесійных спартсменаў, так і проста аматараў здаровага ладу жыцця. Нядаўна мінская траса атрымала сусветнае прызнанне, і цяпер вынікі гэтых спаборніцтваў кацiруюцца ва ўсім свеце.**

Сёлетні паўмарафон сабраў не толькі беларусаў, але і 800 спартсменаў з больш чым 40 краін. Сярод іх як нашы блізкія суседзі — Расія, Украіна, краіны Прыбалтыкі, — так і экзатычныя дзяржавы — Коста-Рыка, Кенія, Японія.

На трасу выходзілі паасобку, сем'ямі і цэлымі арганізацыямі; сярод тых, хто бег, былі заўважаны і вядомыя людзі краіны: кіраўнікі міністэрстваў, прадстаўнікі СМІ, «зоркі» шоу-бізнесу. У маштабным забегу, як і ў мінулым годзе, прынялі ўдзел першыя асобы спартыўнай галіны краіны — **міністр спорту і турызму Аляксандр ШАМКО і першы віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Максім РЫЖАНКОЎ.** Максім Уладзіміравіч, напрыклад, нават змог палепшыць свой леташні вынік.

— Нездарма рыхтаваўся ў камандзе Dream Team, трэніраваўся нават у Рыа. Па вопыце мінулага года магу сказаць, што Мінскі паўмарафон атрымаўся і прайшоў не горш. Многія аматары бегу заявіліся на дыстанцыю ў 5 км, але ніхто пасля фінішу не разыходзіўся. Працягвалі падтрымліваць удзельнікаў, якія яшчэ знаходзіліся на трасе. Надзвычай святочная атмасфера была і каля Палаца спорту. Вельмі рады і за сябе, што змог палепшыць свае паказчыкі, і за людзей, якія сваім прыкладам паказваюць, як любяць у Беларусі займацца спортам, весці здаровы лад жыцця. Мы на правільным шляху, дужа хачу на гэта спадзявацца, — адзначыў пасля фінішу Максім Рыжанкоў.



Хілары Кітум Маё Кімаё.

— Мінскі паўмарафон перасягнуў межы краіны. Забег мае міжнародны статус, у ім бяруць удзел вядучыя спартсмены, — распавядае міністр спорту Аляксандр Шамко. — Пасля фінішу ўдалося пагутарыць з удзельнікамі і прафесійнымі спартсменамі. Самае прыемнае, што падыходзілі і шчыра дзякавалі. Гэта самая вялікая ўзнагарода для мяне, як для міністра спорту, пачуць ад простых аматараў бегу, людзей сярэдняга, старэйшага пакалення, іх ацэнку паўмарафону.

Пераможцай сярод жанчын стала беларуска **Вольга МАЗУРОНАК,** яна пераадолела дыстанцыю ў 21,1 км за 1 гадзіну 11 хвілін 4 секунды. Гэты вынік стаў рэкордам мінскай страсы.

*— Як бы цяжка ні было пасля Рыа, выйшла на старт у Мінску. Шчыра кажучы, перад забегам на 21,1 км не ведала, чаго ад сябе чакаць. Асноўныя саперніцы, кенійкі, ехалі да нас па прызавыя, настрой афрыканак быў вельмі сур'ёзным. У ходзе забегу адстала ад іх, але дзякуючы падтрымцы ўздоўж трасы знайшла ў сабе сілы дабавіць. Траса ў Мінску аказалася вельмі цяжкай, да такога маршруту трэба рыхтавацца,* — адзначыла пераможца.

У спаборніцтвах сярод мужчын перамогу атрымаў **Хілары Кітум Маё Кімаё** з Кеніі.

*— Пасля 10 км я застаўся адзін, мае партнёры адсталі, і бегчы аднаму, увесь час падтрымліваць тэмп вельмі цяжка. Добры вопыт для мяне, дзякуй майму менеджару, якому паступіла прапанова выступіць у сталіцы Беларусі. Шчаслівы, што пераможца,* — падкрэсліў Хілары Кітум Маё Кімаё.

Пераможцы і прызёры разыгралі призавы фонд у 25 тысяч долараў, а ўсе ўдзельнікі атрымалі памятныя медалі.

У параўнанні з Мінскім паўмарафонам-2015 у сёлетнім на старт выйшла на 4 тысячы ўдзельнікаў больш. У наступным годзе арганізатары абяцаюць павялічыць колькасць да 30 тысяч чалавек.

# Каманда з традыцыямі

## ГАНДБОЛЬНЫ СКА ПРАДСТАВІЎ АБНОЎЛЕНЫ СКЛАД І ФОРМУ НА СЕЗОН

**За мінулае лета ў самым тытулаваным клубе краіны адбыліся істотныя змены. Галоўнае з іх — змена трэнера: Спартак Мірановіч, які 40 гадоў вёў за сабой армейцаў, перайшоў на новую клубную пасаду, а месца рулявога заняў Ігар Папруга.**

Істотна абнавіўся і асноўны склад гульцоў: у ліку навічкоў — Міхаіл Жыла, Ігар Чэрнікаў, Павел Міскевіч і Мікалай Алёхін.

Каманда правяла перадсезонныя зборы, прыняла ўдзел у турнірах ва Украіне і Польшчы, а цяпер рыхтуецца да старту новага сезона. Сёлета СКА згуляе ў чэмпіянаце і розыгрышы Кубка Беларусі, а таксама ў міжнародных турнірах — Кубку Еўрапейскай гандбольнай федэрацыі і Балтыйскай лізе.

*— У нас быў насычаны падрыхтоўчы перыяд, і я задаволены, як мы яго правялі. Кіраўнікі клуба забяспечылі якасную падрыхтоўку. У каманды былі выязныя зборы, хлопцы знаходзіліся пастаянна разам, гэта важна — гуртуе калектыў. Мы працавалі па плане, згулялі два турніры, у цэлым я задаволены якасцю гульні. У некаторых момантах, вядома, яшчэ трэба папрацаваць, у нас ёсць на гэта час, таму спадзяёмся, што да адказных гульняў падыдзем баяздольным калектывам,* — падзяліўся **Ігар ПАПРУГА.** *— Што тычыцца маёй новай пасады, то ацэньваць мяне як галоўнага трэнера трэба будзе па выніку, цяпер гэта проста праца, аналіз. Я выкарыстоўваю вопыт, які назапашваў у працы са Спартаком Міратовічам і Юрыем Шаўцовым. Цяпер у мяне шмат ідэй, якія трэба ўвасобіць і апраўдаць аказаны давер.*

Што тычыцца задач на сезон, то Ігар Мікалаевіч адзначыў: у першую чаргу неабходна палепшыць якасць гульні і пастарацца раскрыць кожнага гульца, каб прадстаўнікі СКА ў найлепшай форме падышлі да зборнай. Пра ўзнагароды чэмпіянату краіны і задачы выступлення ў міжнародных турнірах настаўнік палічыў за лепшае змоўчаць.

Адзначым, што дапамагаць Ігару Папругу ў гэтым сезоне будуць Аляксандр Каршакевіч і настаўнік маладзёжнай зборнай Беларусі Алег Шарэйка.

# МІМА ПХЕНЧХАНА

## Хакейная зборная не змагла заваяваць пуцёўку на Алімпіяду-2018

**Кваліфікацыйны турнір да зімніх Гульняў у Карэі, які прайшоў у мінулыя выхадныя ў Мінску, абяцаў падарункі Дэйва Льюіса сур'ёзную барацьбу. На адбор у Беларусь прыехалі зборныя Даніі, Славеніі і Польшчы.**




Здавалася, што самым складаным матчам для нашых хакеістаў павінен быць першы, з датчанамі, бо вікінгі прывезлі ў Мінск досыць сур'ёзны склад, узмоцнены гульцамі Нацыянальнай хакейнай лігі. Аднак беларусы мандражыравалі ў гэтым паядынку толькі на старце, а потым узялі гульню пад свой кантроль і далі сустрэчу да ўпэўненай перамогі 5:2. Наступны матч супраць палякаў нашы хлопцы таксама правялі добра (5:3), нягледзячы на правальны пачатак. А вось к заключнай сустрэчы са зборнай Славеніі стала зразумела, што менавіта гэты паядынак стане вырашальным у барацьбе за адзіную пуцёўку на Гульні.

Зборныя, якія не ведалі паражэнняў у кваліфікацыі, выйшлі на лёд перапоўненай «Мінск-Арэны» пасля выхаднога, а значыць, поўныя сіл. Месца ў беларускіх варотах у вырашальным паядынку заняў малады галкіпер Міхаіл Карнавухаў: асноўны варатар Кевін Лаланд напярэдадні атрымаў сур'ёзную траўму.

У першым перыядзе славенскія хакеісты паразілі вароты гаспадароў двойчы, і толькі ў самым канцы перыяда беларусы змаглі бліжэй да канца матча. Галы — на рахунку Андрэя Сцяпанава. А вось выйсці наперад нашым хлопцам так і не ўдалося: асноўны час скончыўся з роўным лікам 2:2. У авертайме закінутых шайбаў не было, таму ўсё вырашылі пасляматчавыя кідкі, у якіх мацнейшымі аказаліся хакеісты са Славеніі.

— Я чакаў нялростую гульню, яна такой і аказалася. Нашы апаненты строга прытрымліваліся свайго плана на матч, а іх лідар Анжэ Копітар паказаў сваё майстэрства ў серыі булітаў, — расказаў пасля заканчэння паядынку **галоўны трэнер нашай зборнай Дэйв ЛЬЮІС.** — Ва ўсіх гульцоў была мара — трапіць на Гульні. Прайграць па булітах — гэта вельмі цяжка. Мы гулялі дастаткова добра, Джэф Плат да канца асноўнага часу меў фантастычную магчымасць вырашаць зыход сустрэчы. Міхаіл Карнавухаў вельмі добра праявіў сябе, асабліва для такіх маладых гадоў, на ім ляжала вялікая адказнасць. У серыі булітаў на коне была пуцёўка на Алімпіяду, але ён дзейнічаў вельмі добра. Я пагаварыў з камандай пасля матча — яны ўсе вельмі-вельмі расчараваныя. Што тычыцца мяне, то я не мяняюся. У мяне ў камандзе выдатныя хлопцы, з імі прыемна працаваць. Я веру, што яны прыбавілі ў майстэрстве за той час, што я быў у камандзе, — дадаў Льюіс.

Такім чынам, нацыянальная зборная Беларусі па хакеі прапусціць ужо другую запар Алімпіяду. Раней наша дружына тройчы прымала ўдзел у галоўных стартах чатырохгоддзя — у Нагана ў 1998-м, у Солт-Лэйк-Сіці ў 2002-м і ў Ванкуверы ў 2010-м.

# БЛІЖЭЙ ДА НАРОДА

## Футбольная зборная правяла адкрытую трэніроўку

**Напярэдадні старту адборачных гульняў чэмпіянату свету нацыянальная зборная па футболе ў нефармальнай абстаноўцы сустрэлася са сваімі балельшчыкамі. Ва ўсіх ахвотных была магчымасць не толькі сфатаграфавацца з гульцамі і ўзяць аўтограф, але і задаць любое пытанне футбалістам.**



На палях федэрацыі футбола, дзе працуе зборная, сабралася небывалая колькасць заўзятараў. Простая трэніроўка ператваралася ў сапраўднае свята. Музыка, калекцыянеры, атрыбутыка і нават пеўні — усё гэта стварыла аматарам спорту, ды і самім футбалістам, выдатны настрой.

— Той факт, што прыйшло столькі гледачоў, вельмі радуе. Добра, калі такія акцыі будуць працягвацца. Калі ішлі па калідоры з заўзятараў, было вельмі прыемна, чулі апладысменты. Можа быць, у нейкай ступені гэта аванс. Але, думаю, хлопцы ўсё гэта заслужаць гульнёй у матчы з Францыяй, — сказаў **галоўны трэнер зборнай Аляксандр ХАЦКЕВІЧ.**

— Нас папярэдзілі, што прыйдуць людзі, папрасілі не адмаўляць балельшчыкам на ўвазе, — кажа **Ігар ШЫТАЎ.** — Рады, што ўдалося пагутарыць, абмяняцца энергіяй. У першы раз трохі няўтульна, але ў той жа час прыемна і хвалююча. Ніколі яшчэ такога не было, — дадаў футбаліст.

Вядома, напярэдадні матча са зборнай Францыі не магло абысціся без пытанняў аб маючым адбыцца паядынку і тым, чаго чакаць заўзятарам ад гэтага матча.

— Французы, вядома, будуць атакаваць больш, чым мы, — дзяліцца сваімі думкамі **Сяргей КРЫВЕЦ.** — Валодаць мячом таксама будуць больш. Таму наша задача — чакаць моманту, быць цярплівымі і бегчы ў контратакі. Французы — фіналісты чэмпіянату Еўропы, адна з наймацнейшых камандаў свету, у складзе гэтай зборнай шмат добрых футбалістаў. Яны моцныя не толькі індывідуальна, але і каманднымі дзеяннямі. Усё ж думаю, і ў іх ёсць слабыя бакі, трэба пастарацца іх знайсці.

Нагадаем, зборная Беларусі, якая выступае ў кваліфікацыйнай групе А, сёння на полі «Барысаў-Арэны» згуляе з віцэ-чэмпіёнамі Еўропы футбалістамі Францыі. Зборная Балгарыі прыме каманду Люксембурга, Швецыя згуляе з Нідэрландамі.

Матэрыялы старонкі падрыхтавала
Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. lobazhevich@zviazda.by

# ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ (пос. Фабричный, ул. Кстинская, микрорайоны «Заболоть», «Зарица-5», «Барановичи-5,6») в собственность в г. Гродно 6 октября 2016 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Стоимость затрат на изготовление документации (с учетом деноминации), руб. | Начальная цена продажи, (с учетом деноминации), руб. | Сумма задатка (с учетом деноминации), руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок У-11* | пос. Фабричный | 0,0830 | 440100000001009133 | 1 713,01 | 9 822,38 | 1 800 |
| 2 | Земельный участок У-3* | ул. Кстинская, в районе домовладения № 14 | 0,0703 | 440100000001009488 | 2 660,99 | 17 790,75 | 4 000 |
| 3 | Земельный участок У-69* | м-н «Заболоть» | 0,1028 | 440100000003005421 | - | 12 200,00 | 2 500 |
| 4 | Земельный участок У-139* | м-н «Зарица-5» | 0,0977 | 440100000003004992 | - | 12 418,4 | 2 600 |
| 5 | Земельный участок У-191* | м-н «Барановичи-5,6» | 0,0986 | 440100000003005176 | - | 10 500,0 | 2 100 |

**Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома.*

**Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».**

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 № 49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 6 октября 2016 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участий в аукционе необходимо: внести задаток не позднее **3 октября 2016 года** в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет №3012000041810 в филиале № 400 Гродненском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению;

**представить в ГП «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;**

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

**дополнительно представляются:**

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе гражданe Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. 57 с 5 сентября по 3 октября 2016 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан;

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 46, 72 05 37, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by**

# Извещение о проведении аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Жабинка Брестской области

| № лота | Адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Срок аренды, лет | Начальная цена предмета аукциона (BYN) | Сумма задатка (BYN) | Расх. по подг. земел.-кадастр. док. (BYN) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Жабинка, ул. Молодежная, 18 | 122550100002000405 | 0,0212 | Строительство магазина непродовольственных товаров | 99 | 7 854,11 | 1 570 | 566,02 | Ограничений в использовании земель нет |
| 2 | г. Жабинка, пер. Приозерный, 1 | 122550100001002613 | 0,1433 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | 99 | 7 943,68 | 1 588 | 615,54 | 0,1433 га – водоохранная зона пруда Визжар и канала Безымянный |
| 3 | г. Жабинка, пер. Приозерный, 3 | 122550100001002614 | 0,1383 | | 99 | 7 666,51 | 1 533 | 616,05 | 0,1383 га – водоохранная зона пруда Визжар и канала Безымянный |
| 4 | г. Жабинка, пер. Приозерный, 5 | 122550100001002615 | 0,1425 | | 99 | 7 899,33 | 1 579 | 593,99 | 0,1425 га – водоохранная зона пруда Визжар и канала Безымянный |
| 5 | Жабинковский с/с, юго-западнее д. Здитово | 122580603602000003 | 4,3329 | Строительство комплекса агроэкотуризма | 50 | 33 422,23 | 6 684 | 195,60 | 0,0987 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт; 4,3329 га – водоохранная зона р. Мухавец |

**ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ – КУП «БРЕСТСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР ПО УПРАВЛЕНИЮ НЕДВИЖИМОСТЬЮ»**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. №462, и состоится при наличии не менее двух участников.**

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором аукционных торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924**.

**Земельный участок предоставляется победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона с условиями:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победителем такого аукциона или в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся единственным участником несостоявшегося аукциона:

- внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка путем перечисления на расчетный счет финансового отдела исполкома;
- возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, а также затрат, связанных с формированием земельного участка, государственной регистрацией в отношении этого участка;

• не позднее двух рабочих дней после внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка и возмещения затрат заключить с исполнительным комитетом в установленном порядке договор аренды земельного участка и в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией права на земельный участок в Жабинковское бюро Кобринского филиала РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;

• получения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в трехмесячный срок со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на земельный участок в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство объекта;

• занятия (освоения) победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона земельного участка не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта;

• снятия победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона на земельном участке плодородного слоя почвы из под пятен застройки и использования его для благоустройства участка.

**Дополнительно по лоту №1 и №5:**

• получить в установленном порядке АПЗ и тех. условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проектную документацию на строительство объекта в срок, не превышающий по лоту № 1 – одного года и по лоту № 5 – двух лет;

• приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта и завершить строительство объекта в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией.

**Аукцион состоится 6 октября 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Жабинка, ул. Кирова, 65 (зал заседаний). Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 06.09.2016 г. до 17.30 30.09.2016 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. ул. Ленина, 50. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by и www.gki.gov.by**

# Извещение о проведении аукционных торгов в Жабинковском районе Брестской области в частную собственность граждан Республики Беларусь ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

| № лота | Адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Начальная цена предмета аукциона (BYN) | Сумма задатка (BYN) | Расхож. по подг. земел.-кадастр. док. (BYN) | Наличие ограничений и охранных зон на земельном участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Ракитницкий с/с, д. Бульково, ул. Чапаева, 51 | 122582400601000229 | 0,1750 | 2 497,30 | 499 | 1 234,36 | ограничений в использовании земель нет |
| 2 | Ракитницкий с/с, д. Бульково, ул. Чапаева, 53 | 122582400601000230 | 0,1518 | 2 166,24 | 433 | 1 198,65 | ограничений в использовании земель нет |
| 3 | Ракитницкий с/с, аг. Ракитница, ул. Ольховая, 12 | 122582403101000523 | 0,1509 | 2 481,07 | 496 | 1 214,68 | ограничений в использовании земель нет |
| 4 | Ракитницкий с/с, д. Задерть, ул. Центральная, 33 | 122582401601000068 | 0,1581 | 1 397,48 | 279 | 928,65 | ограничений в использовании земель нет |
| 5 | Ракитницкий с/с, д. Федьковичи, ул. Весенняя, 10 | 122582404601000217 | 0,1513 | 1 220,36 | 244 | 52,5 | ограничений в использовании земель нет |
| 6 | Ленинский с/с, д. Рогозно, ул. Центральная, 72 | 122581503601000115 | 0,2127 | 2 037,57 | 407 | 1 289,89 | ограничений в использовании земель нет |
| 7 | Ленинский с/с, д. Филипповичи, ул. Центральная, 28А | 122581504101000071 | 0,2442 | 2 205,44 | 441 | 1 278,27 | 0,0026 га – охранная зона электропередачи напряжением до 1000 В |
| 8 | Ленинский с/с, д. Филипповичи, ул. Центральная, 49А | 122581504101000070 | 0,1477 | 1 333,92 | 266 | 1 208,42 | ограничений в использовании земель нет |
| 9 | Ленинский с/с, д. Филипповичи, ул. Центральная, 51 | 122581504101000069 | 0,1568 | 1 416,09 | 283 | 1 210,67 | ограничений в использовании земель нет |
| 10 | Хмелевский с/с, д. Соколово, ул. Центральная, 1А | 122583604601000114 | 0,1641 | 1 834,06 | 366 | 1 279,59 | 0,1641 га – водоохранная зона прудов ОАО «Рыбхоз Соколовский Гусак», 0,1641 га – санитарная зона охраны водозабора |
| 11 | Хмелевский с/с, д. Соколово, ул. Центральная, 16 | 122583604601000115 | 0,2500 | 3 632,36 | 726 | 1 331,05 | 0,0675 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, 0,0042 га – охранная зона электропередачи напряжением до 1000 В, 0,2500 га – водоохранная зона прудов ОАО «Рыбхоз Соколовский Гусак», 0,2500 га – санитарная зона охраны водозабора |
| 12 | Хмелевский с/с, д. Соколово, ул. Центральная, 24 | 122583604601000116 | 0,1279 | 1 429,47 | 285 | 1 279,07 | 0,0030 га – охранная зона электропередачи напряжением до 1000 В, 0,1279 га – водоохранная зона прудов ОАО «Рыбхоз Соколовский Гусак», 0,1279 га – санитарная зона охраны водозабора |
| 13 | Жабинковский с/с, д. Здитово, ул. Жасминовая, 9 | 122580603601000253 | 0,1665 | 5 194,12 | 1 038 | 855,76 | 0,0055 га – охранная зона электропередачи напряжением до 1000 В, 0,1665 га – водоохранная зона реки Мухавец |
| 14 | Жабинковский с/с, д. Здитово, ул. Жасминовая, 10 | 122580603601000254 | 0,1612 | 5 028,78 | 1 005 | 855,76 | 0,1612 га – водоохранная зона реки Мухавец |
| 15 | Жабинковский с/с, аг. Большие Яковчицы, ул. Центральная, 74 | 122580601101000138 | 0,2500 | 2 257,06 | 451 | 884,96 | ограничений в использовании земель нет |
| 16 | Жабинковский с/с, аг. Большие Яковчицы, ул. Центральная, 75 | 122580601101000139 | 0,2437 | 2 200,19 | 440 | 835,70 | 0,0055 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В, 0,0120 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения |
| 17 | г. Жабинка, ул. Приозерная, 4 | 122550100001002609 | 0,1303 | 14 446,07 | 2 889 | 563,68 | 0,1303 га – водоохранная зона пруда Визжар и канала Безымянный |
| 18 | г. Жабинка, ул. Приозерная, 6 | 122550100001002610 | 0,1262 | 13 991,51 | 2 798 | 563,68 | 0,1262 га – водоохранная зона пруда Визжар и канала Безымянный |
| 19 | г. Жабинка, ул. Приозерная, 8 | 122550100001002611 | 0,1265 | 14 024,77 | 2 804 | 563,33 | 0,1265 га – водоохранная зона пруда Визжар и канала Безымянный |
| 20 | г. Жабинка, пер. Приозерный, 11 | 122550100001002616 | 0,1177 | 13 049,14 | 2 609 | 603,69 | 0,1177 га – водоохранная зона пруда Визжар и канала Безымянный |

**Целевое назначение использования участков – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома**

**дополнительное условие:**

по лоту №1 и №2: подключение электроснабжения к земельному участку от существующей линии электропередачи в д. Бульково по ул. Чапаева за счет собственных средств победителя аукциона, либо единственного участника несостоявшегося аукциона.

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью».**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе**, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Сумма задатка перечисляется на счет КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» № 3012780360011 открытый в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, ул. Московская, 202, код банка 246, УНП 290433924.**

**Земельный участок предоставляется победителю аукциона, либо единственному участнику несостоявшегося аукциона с условиями:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победителем такого аукциона или в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся единственным участником несостоявшегося аукциона:

- внесения платы за земельный участок на расчетный счет соответствующего с/с (РИК);
- возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и затрат, связанных с формированием земельного участка, государственной регистрацией в отношении этого участка;

• обращения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в двухмесячный срок после подписания протокола о результатах аукциона или признания аукциона продажи несостоявшимся за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

• получения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в установленном порядке и сроки технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

• занятия (освоения) победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона земельного участка не позднее одного года после государственной регистрации права на него;

• снятия победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона на земельном участке плодородного слоя почвы из под пятен застройки и использования его для благоустройства участка.

**Аукцион состоится 6 октября 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Жабинка, ул. Кирова, 65 (зал заседаний). Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 06.09.2016 г. до 17.30 30.09.2016 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. ул. Ленина, 50. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by и www.gki.gov.by**

# Гараскоп стрыжак на верасень

***6 верасня, аўторак.*** Стрыжка пагоршыць стан валасоў, яны будуць адрастаць тонкімі і ломкімі, да таго ж ёсць рызыка пасля стрыжкі застудзіцца.

***7 верасня, серада.*** Стрыжка сёння можа прывесці да непрыемных наступстваў, сапсаваць настрой і знешні выгляд.

***8 верасня, чацвер.*** Добры дзень для стрыжкі ў маладзёжным стылі, афарбоўкі ў яркія колеры. Хімічная завіўка доўга не пратрымаецца.

***9 верасня, пятніца.*** Сёння не варта стрыгчыся без крайняй неабходнасці, можа пацярпець самаадчуванне і сапсавацца настрой.

***10 верасня, субота.*** Перанясіце стрыжку на другі дзень, калі не хочаце сапсаваць настрой і здароўе.

***11 верасня, нядзеля.*** Сёння дзень традыцыйных прычосак. Добра ісці да праверанага гадамі майстра. Афарбоўка добрая ў цёмныя колеры, можна ўдала і надоўга зафарбаваць сівізну, фарба ўбярэцца глыбока.

***12 верасня панядзелак.*** Не варта сёння выпраўляцца ў цырульню, калі не хочаце прыцягнуць у сваё жыццё праблемы.

***13 верасня, аўторак.*** Сёння няўдалы дзень для стрыжкі. Валасы могуць не пацярпець, але ёсць небяспека прыцягнуць сабе на галаву непрыемнасці.

***14 верасня, серада.*** Строгія класічныя прычоскі сёння атрымаюцца асабліва ўдала. Добры дзень для наведвання пастаяннага майстра.

***15 верасня, чацвер.*** Не стрыжыцеся: час неспрыяльны для любых маніпуляцый з валасамі і пазногцямі. Валасы будуць цяжка адыходзіць ад механічнага ўздзеяння.



***16 верасня, пятніца.*** Стрыжка катэгарычна супрацьпаказана, яна можа прынесці не толькі шкоду валасам, але і пагрозу здароўю.

***17 верасня, субота.*** Дрэнны час для стрыжкі, вы можаце прыцягнуць да сябе непрыемнасці і нанесці шкоду здароўю.

***18 верасня, нядзеля.*** Час вельмі кепскі для стрыжкі. Адкладзіце наведванне цырульні, вы можа прыцягнуць на сваю галаву праблемы і хваробы.

***19 верасня, панядзелак.*** Стрыжка можа прывесці да непрыемных наступстваў у лёсе і дрэннага настрою. Абмяжуйцеся штодзённым доглядам і ўкладкай.

***20 верасня, аўторак.*** Калі вы даўно збіраліся да цырульніка, то наведайце яго сёння. Прыгожыя прычоскі, афарбоўванне і завіўка — усё атрымаецца добра.

***21 верасня, серада.*** Стрыжка ў гэты дзень можа выклікаць дэпрэсію і нервовасць, перанясіце яе на іншы дзень.

***22 верасня, чацвер.*** Дзень добры для стрыжкі, але не плануйце доўгіх працэдур у цырульні, таму што яны могуць вас стаміць.

***23 верасня, пятніца.*** Са стрыжкай, зробленай у гэты дзень, вашы матэрыяльныя справы пойдуць больш паспяхова, але яна можа нашкодзіць валасам.

***24 верасня, субота.*** Вы можаце заплаціць за паслугі цырульніка больш, чым планавалі. Калі гатовыя да расходаў, то атрымаеце новы непаўторны імідж. Стрыжка будзе ўдалай.

***25 верасня, нядзеля.*** Сёння самы добры дзень для стрыжкі за ўвесь бягучы месяц. Ідзіце да цырульніка, калі хочаце палепшыць стан валасоў, знешнасць у цэлым і матэрыяльнае становішча.

***26 верасня, панядзелак.*** Дзень неспрыяльны для стрыжкі, таму што прыцягвае хваробы. Але можна рабіць працэдуры, якія ўмацоўваюць валасы, і ўкладкі.

***27 верасня, аўторак.*** Сёння валасы адчуваюць сябе выдатна, стрыжка іх толькі палепшыць, аднак не стрыжыцеся, калі адчуваеце недамаганне.

***28 верасня, серада.*** Сёння выдатны дзень для стрыжкі валасоў і пазногцяў. Пасля стрыжкі валасы стануць густымі і моцнымі, афарбоўванне і завіўка атрымаюцца ўдалымі.

***29 верасня, чацвер.*** Дзень спрыяльны для стрыжкі, афарбоўвання ў натуральныя колеры і хімічнай завіўкі. Фарба ляжа мякка, валасы будуць адрастаць павольна, прычоска будзе трымацца доўга.

***30 верасня, пятніца.*** Спрыяльныя вынікі можна будзе назіраць пасля стрыжкі ў гэты дзень. Акуратны знешні выгляд і выдатная форма прычоскі падкрэсліць ваш добры густ. Пасля стрыжкі будуць марудна адрастаць здаровыя валасы.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.27 | 19.47 | 13.20 |
| Віцебск — | 6.15 | 19.39 | 13.24 |
| Магілёў — | 6.17 | 19.38 | 13.21 |
| Гомель — | 6.16 | 19.32 | 13.16 |
| Гродна — | 6.43 | 20.02 | 13.19 |
| Брэст — | 6.45 | 20.00 | 13.15 |

## Месяц

*Маладзік 01.09—08.09.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

## Імяніны

***Пр.*** *Арсенія, Георгія, Пятра.*
***К.*** *Яўгеніі, Захара, Германа, Міхала, Яўгена.*



Фота Надзеі БУЖАН.

# ЗАЎТРА




## ■ Ну і ну!

### ЗЛАМАНАЕ — ЯК СПРАЎНАЕ

**Участковы інспектар міліцыі аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Партызанскага РУУС сталіцы капітан Аляксей Котаў па падазрэнні ва ўчыненні махлярства затрымаў 40-гадовага гараджаніна.**

Мужчына на інтэрнэт-сайтах знаходзіў аб'явы аб продажы непрацуючых халадзільнікаў, набываў іх па нізкім кошце, а затым пад выглядам спраўных прадаваў па завышанай цане. Зламыснік такім чынам паспеў рэалізаваць чатыры халадзільнікі, агульны кошт якіх склаў каля 600 дэнамінаваных рублёў. У дачыненні да мужчыны заведзена крымінальная справа за махлярства, максімальнае пакаранне па якой прадугледжвае пазбаўленне волі на тэрмін да чатырох гадоў.

### ПРАДАВАЎ ВЕЛАСІПЕДЫ... АРАНДАВАНЫЯ Ў ПУНКЦЕ ПРАКАТУ

**Супрацоўнікамі міліцыі затрыманы мужчына, які браў у арэнду ровары ў сталічных пунктах пракату і прадаваў іх на рынку.**

— Раней неаднаразова судзімы за маёмасныя злачынствы 39-гадовы мінчанін, які нідзе не працуе, у сталічных пунктах пракату афармляў на сваё імя дагаворы арэнды веласіпедаў на тэрмін ад гадзіны да сутак. Пасля мужчына ад'язджаў, але не на велапрагулкі, а адразу на сталічны рынак, дзе прадаваў велатранспарт па 80 беларускіх рублёў, — паведаміла прэс-афіцэр Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна Абозная. — Грошы траціў на асабістыя патрэбы, у асноўным на куплю спіртнога. Акрамя таго, мужчына прасіў сваіх знаёмых аформіць на іх імя дагавор арэнды і перадаць веласіпед яму. Мужчына тлумачыў, што да яго ў госці прыехалі сваякі і ён хоча з імі пакатацца, а на сябе ўжо аформіў дагавор арэнды і яму больш не дадуць ровар. Знаёмыя дапамагалі. Ужо выяўлена 10 фактаў продажу арандаваных веласіпедаў. Супрацоўнікі міліцыі вярнулі два з іх. Работнікі пунктаў пракату з заявамі ў міліцыю звярталіся не адразу — спрабавалі вярнуць маёмасць сваімі сіламі. Тэлефанавалі па нумары тэлефона, які зламыснік і яго знаёмыя пакідалі ў дагаворы арэнды. Мужчына абяцаў, але не вяртаў велатэхніку. У пунктах пракату чакалі ад тыдня да месяца, а пасля звярнуліся з заявамі ў міліцыю.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## Даты | Падзеі | Людзі

### 6 ВЕРАСНЯ

**1766** год — нарадзіўся Джон Дальтон, англійскі хімік і фізік, які ўвёў паняцце атамнай вагі і склаў першую табліцу атамнай вагі элементаў. У 1794 годзе ўпершыню апісаў дэфект зроку, на які пакутаваў сам (пазней названы дальтанізмам).

**1936** год — зацверджана ганаровае званне «Народны артыст СССР». Да 1917 года дзяржаўных званняў і ўзнагарод у галіне культуры ў краіне не было. Іх сталі прысуджаць у савецкі час. Званне «Народны артыст» было ўстаноўлена ў 1918 годзе, і першым, хто быў уганараваны гэтым званнем, стаў геніяльны Фёдар Шаляпін. Са жніўня 1931 года стала прысуджацца званне «Заслужаны артыст РСФСР». Мастакам, архітэктарам, кампазітарам прысуджалася званне заслужанага дзеяча мастацтваў. 6 верасня 1936 года УЦВК заснаваў званне «Народны артыст СССР» для асоб, якія «асабліва праславіліся ў справе развіцця савецкага тэатра, музыкі і кіно». Гэта было першае вышэйшае ганаровае званне ў краіне. Пазней з'явіліся народныя настаўнікі, народныя мастакі і народныя архітэктары. Першай у Беларусі гэтага звання была ўдастоена Л.П. Александроўская.



**1936** год — 80 гадоў таму нарадзіўся (вёска Баяры, цяпер у Карэліцкім раёне) Фёдар Уладзіміравіч Мірачыцкі, савецкі і беларускі дзяржаўны дзеяч, былы міністр сельскай гаспадаркі, член-карэспандэнт Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь (1992), заслужаны работнік сельскай гаспадаркі.

**1946** год — нарадзіўся (г. Мінск) Вячаслаў Дзмітрыевіч Селяменеў, беларускі гісторык-архівіст, кандыдат гістарычных навук. Аўтар даследаванняў па гісторыі Беларусі з 1917 г., пытаннях архівазнаўства. Адзін з аўтараў кніг «Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь», «Аўстрыйцы і судзэцкія немцы перад савецкімі ваеннымі трыбуналамі ў Беларусі. 1945-1950». Адзін з укладальнікаў даведнікаў «Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўладкаванне БССР», зборнікаў дакументаў і матэрыялаў «Беларускія остарбайтары», «Азарычы — лагер смерці» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2002).

#### Было сказана

**Янка БРЫЛЬ, народны пісьменнік Беларусі:**
*«Няма патрэбы хваліцца тым, што ад пачатку і назаўсёды тваё».*

## УСМІХНЕМСЯ

— Слухай, ты дзе так загарэў?
— Агарод у нядзелю капаў...
— Прыходзь заўтра да мяне загараць!

**Мы нядаўна адкрылі кругласутачны магазін — «Будматэрыялы» называецца. Хочацца паглядзець на людзей, якія ў тры гадзіны ночы па цвікі прыйдуць!**

— Колькі табе гадоў?
— Дваццаць сем.
— Якое дасягненне ты лічыш самым значным у сваім жыцці?
— Дабег да кухні раней за кошку.

**— Колькі гарэлкі ні пі, — уздыхаў алкаголік Сідарчук, — а арганізм усё роўна на 90% складаецца з вады!**




Малюнак Аляксандра ШМІТА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3611.

Нумар падпісаны ў 19.30 5 верасня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12